Збуч - 2010 ☞ 4

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Сцяпан Копа ☞ 8-10

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 40 (2838) Год LV | Беласток, 3 кастрычніка 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Белліцэй — у супольнай сям'і

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Любоў да сваёй школы і прывязанасць да атмасферы, якую стваралі ў Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім настаўнікі і вучні, гуртуюць яго выпускнікоў, якія маюць патрэбу і хочуць наведваць месца, дзе ў маладосці вучыліся і радасна праводзілі час. За звыш шэсцьдзесят гадоў дзейнасці Бельскага белліцэя закончыла тут адукацыю звыш пяці тысяч асоб, якія пасля раз'ехаліся па Беласточчыне, Польшчы, а нават сталі жыць у далёкіх кутках свету. На VII З'езд выпускнікоў белліцэя, які праходзіў з 24 па 26 верасня, прыбылі людзі розных прафесій і розных зацікаўленняў. У прыгожа адрамантаваным школьным будынку спаткаліся святары, настаўнікі, лекары, інжынеры, людзі культуры і масмедыяў, навуковыя працаўнікі і прадпрымальнікі. Усе яны мелі вялікую прагу паразмаўляць аб школьных гадах, якія правялі ў роднай беларускай атмасферы. Вялікі гоман і шорхат панаваў на школьным калідоры ў час рэгістрацыі ўдзельнікаў з'езда. Асабліва чулівымі, а нават слязлівымі былі прывітанні і абдымкі самых старэйшых навучэнцаў беларускай школы, якія не бачыліся многімі гадамі. Многа радасці, а нават і смеху было ў час першых размоў, якія праводзілі малодшыя выпускнікі бельскай школы.

Галоўны, суботні, дзень з'езда распачаўся з літургіі ў Міхайлаўскай царкве, пасля якой у школьным будынку старшыня аргкамітэта, бельскі віцэ-стараста Пётр Божка афіцыйна адкрыў мерапрыемства і прывітаў гасцей, сярод якіх былі праваслаўныя і каталіцкі святары, госці з Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі мясцовых самаўрадаў, беларускіх арганізацый і масмедыяў. Залу шчыльна запоўнілі выпускнікі, бо на вялікую сустрэчу прыбыло больш за 250 былых вучняў Бельскага белліцэя (сярод іх асобы са ЗША і Швецыі).

— Гэты з'езд — асаблівы час для беларускага асяроддзя і Бельскага павета. Наша школа асаблівая таму, што мы тут правялі найлепшыя свае гады. У сценах ліцэя мы станавіліся дарослымі, вучыліся жыць, завязвалі сяброўства, якое працягваецца гадамі. У час з'ездаў мы спатыкаемся і бачым, колькі ў нас зычлівасці і радасці ад гэтых сустрэч. Нават узрост і год здавання матуральных экзаменаў не маюць тут значэння. Мы тут ствараем адну супольную сям'ю, — заявіў Пётр Божка, які гаварыў таксама пра высокі ўзровень навучання ў белліцэі і пра магчымасці разгортвання ўмеласцей і здольнасцей вучняў у добрых памяшкальных умовах. Апошнім часам, у галоўным за сродкі МУСіА, быў адрамантаваны школьны будынак звонку і частка яго ўсярэдзіне.

— Мы не тыя беларусы ў лапцях. У нас у школе ёсць інтэрактыўныя дошкі, — гаварыў дырэктар белліцэя Андрэй Сцепанюк, які напомніў пра поспехі вучняў у прадметных алімпіядах і ў час матуральных экзаменаў (2 месца ў Падляшскім ваяводстве і 12 у Польшчы паводле рэйтынгу „Перспектываў"). Бельскі стараста Славамір Ежы Снарскі ўзнагародзіў дырэктара Андрэя Сцепанюка і самых лепшых настаўнікаў белліцэя. У час мерапрыемства ўспаміналіся таксама былыя настаўнікі. Хвілінай цішыні была ўшанавана памяць памерлых педагогаў і вучняў, а выступаючыя многа цёплых слоў сказалі ў адрас памерлых дырэктараў — Яраслава Кастыцэвіча, Міколы Гайдука і Зінаіды Навіцкай (удзельнікі з'езда пасля галоўнай урачыстасці наведалі таксама бельскі могільнік, дзе маліліся каля магіл педагогаў і выпускнікоў). Перад сабранымі выступілі госці і выпускнікі, а папоўнілі іх вядучыя, якія з белліцэя трапілі ў журналістыку — Маргарыта Пракапюк і Юрый Каліна. Былі зачытаны таксама віншавальныя лісты ад мітрапаліта Варшаўскага і ўсяе Польшчы Савы, міністра культуры РБ Паўла Латушкі і амбасадара РБ у Польшчы Віктара Гайсёнка. Два апошнія прачытаў дырэктар Цэнтра культуры Беларусі ў Польшчы Аляксандр Карачун, які прывёз у белліцэй і „тройку" падручнікі і кніжкі. Як прадстаўнік самых старэйшых выпускнікоў выступіў Юрый Паплаўскі, які закончыў вучобу ў белліцэі ў 1945 годзе, і ў вершаванай форме расказаў як школа дапамагла яму выбраць у жыцці добрую дарогу. Пра добрыя дарогі, якія выбіралі бельскія выпускнікі, гаварыў таксама былы дырэктар Аляксей Карпюк.

Вельмі ўдала запрэзентаваліся белліцэісты з мастацкай часткай. Беларускімі меладычнымі песнямі захапілі публіку „Дзявочыя ноткі", цікава дэкламавалі маладыя акцёры, а вельмі гарачыя апладысменты атрымалі школьныя танцоры, якія станцавалі „Лявоніху". Галоўная сустрэча закончылася спяваннем на зважай усімі ўдзельнікамі з'езда школьнага гімна „Люблю наш край, старонку гэту...", што выклікала ўзнёслы настрой з пачуццём прыналежнасці да вялікай беларускай грамады. Аргкамітэт з'езда рашыўся ладзіць яго на працягу трох дзён, каб удзельнікі мерапрыемства мелі магчымасць правесці супольна больш часу і больш паўспамінаць мінулае. Найбольш нагод для ўспамінаў было ў час сяброўскай сустрэчы на школьным панадворку, падчас балю выпускнікоў і класных спатканняў. З'езд распачаўся ў пятніцу з адкрыцця ў бельскай ратушы выстаўкі арганізаванай пад наглядам дырэктар Аліны Дэмбоўскай „Краявід створаны ў марах", на якой свае работы паказалі выпускнікі Бельскага белліцэя і іншыя мастакі, між іншым з Бельска-Падляшскага, Гайнаўкі ці Нурца. Самая вялікая колькасць прац там Маргарыты Дмітрук (літаграфіі пад загалоўкам „Паніхіда — гісторыя ў 40 кадрах"). У адпаведнасці з загалоўкам, на выстаўцы ёсць многа краявідаў, напрыклад Пятра Гагана, Славаміра Рыбака ці Анатоля Краўчука, намаляваных алейнай фарбай, але побач іх знаходзяцца больш абстрактныя работы, напрыклад алейныя Віктара Кабаца, ці фатаграфіі-партрэты Міколы Несцяровіча. Разам 13 аўтараў прэзентуюць працы выкананыя ў разнароднай тэхніцы, напрыклад, акварэллю, тушшу, гуашшу ці габелена.

9 770546 196000

Ад бітвы да кампаніі

Дзве нацыянальныя падзеі адбыліся напрыканцы мінулага тыдня ў Беларусі. Па-першае, гэта доўга анансаваныя дажынкі, якія прайшлі ў Лідзе. Па-другое, фактычны старт выбарчай прэзідэнцкай кампаніі. Старадаўняе народнае свята дажынкі ў сучаснай Беларусі даўно пераўтварылася ў савецкі „дзень перамогі-два". Балазе яшчэ, што вайсковую тэхніку не прыганяюць на гэты парадны фэст заканчэння бітвы за ўраджай. Сёлета на дажынкі была ўбухана рэкордная сума грошай, але ж на такую справу дзяржаве нічога не шкода. Як кажуць, усё для фронту, усё для народа. Як звыкла сабраліся лепшыя людзі краіны. У цэнтры ўвагі канешне ж апынуўся дзейсны кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Рыгоравіч падвёў вынікі паспяховых баталій на палях, прывёў пераканаўчыя лічбы і з аднаму яму ўласцівай простасцю пастараўся запэўніць прысутных журналістаў урадавых медый у несумненнасці вынікаў маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбараў. Журналісты, дарэчы, на вулічнай прэс-канферэнцыі былі чамусьці без дыктафонаў (па адной з версій з гледзішча бяспекі) і нібы члены ўрада натавалі ўсё сказанае звычайнымі асадкамі. Без пэўнага эпатажу, аднак, не абышлося. Двойчы Аляксандр Рыгоравіч выславіўся па-беларуску і двойчы ў кантэксце прагнозу выбараў. Прычым, калі першая фраза датычылася характарыстыкі „ворагаў народу", то іншая прагучала проста фаталістычна: „Каму наканавана быць застрэленым, той не патоне". Так што дажынкі сталіся гэткім пераходам ад бітвы за ўраджай да выбарчай кампаніі.

Ужо на гэтым тыдні стала ясна, хто з 19 чалавек, што падалі ў Цэнтрвыбаркам на рэгістрацыю ініцыятыўныя групы, атрымае права на збор подпісаў у сваю падтрымку. Заканадаўства прадугледжвае для гэтага мінімальныя сто тысяч. Зразумела, што частка псеўдапрэтэндэнтаў адсеецца адразу. Прэзідэнтам спярша захацела стаць нават нейкая санітарка (яшчэ класік сацыялізму Уладзімір Ільіч казаў, што кожная кухарка можа кіраваць дзяржавай), аднак своечасова схамянулася і перадумала. Тым больш, што падала на рэгістрацыю мізэрную ініцыятыўную групу — ніжэй вызначанага парога ў 100 чалавек. Яшчэ некалькі вылучэнцаў служаць гэткім дэкаратыўным прыдаткам да генеральнай асобы, відаць з мэтай адцягнення галасоў ад апазіцыі. Сярод стракатай дэмакратычнай плыні таксама дастаткова чыста тэхнічных прэтэндэнтаў. Нягледзячы на іх гучныя заявы, мала хто верыць у магчымасць рэальнасці збору іхнымі штабамі патрэбнай колькасці галасоў. Сярод тых, хто здольны на нешта сур'ёзнае, некалькі прэтэндэнтаў: лідар грамадзянскай кампаніі „Гавары праўду!" Уладзімір Някляеў, намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Яраслаў Раманчук, лідар кампаніі „Еўрапейская Беларусь" Андрэй Саннікаў, намеснік старшыні Партыі БНФ Рыгор Кастусёў, сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі „Беларуская хрысціянская дэмакратыя" Віталь Рымашэўскі. Іхныя ініцыятыўныя групы налічваюць ад 1500 да 2500 чалавек. Гэта, канешне, зусім не гарантыя, што ўсе яны збяруць патрэбную (зусім немалую ў варунках Беларусі) колькасць подпісаў. Што датычыць радыкальнасці, то найбольш катэгарычна выказваюцца пакуль двух — Уладзімір Някляеў і Андрэй Саннікаў.

Але найбольшую цікавасць выклікае фігура нібыта апазіцыйнага Сяргея Гайдукевіча. Па вялікім рахунку яго і палітыкам не назавеш. Усплывае на паверхню гэтая асоба раз у пяць гадоў, а потым гэтак жа раптоўна знікае. Так было ў 2001 і 2006 гадах і вось трэці выхад на авансцэну. Пры тым Гайдукевіч безапеляцыйна заяўляе, што на гэтых выбарах яму няма роўнага саперніка — ні сярод апазіцыі, ні сярод улады. Двойчы старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі, якая па яго словах налічвае каля 40 тысяч чалавек (лічба па беларускіх мерках неверагодная) граў у фарватары дзейснага прэзідэнта. Але на гэты раз ён можа стаць гэткім „траянскім канём" для ўлады. Менавіта Гайдукевіч і яго ініцыятыўная група, якая налічвае 10 з паловай тысяч чалавек (больш чым у Лукашэнкі!), можа быць сапраўднай крэатурай Крамля, а не хто іншы з апазіцыянераў. Безумоўна, пры пэўным развіцці падзей і пэўным знешнім сцэнары. Кампанія пачалася...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Як я расчараваўся

Ад часу, калі я закончыў беларускую філалогію ва ўніверсітэце ў Беластоку, раздумваю, ці вышэйшая гуманітарная адукацыя мае сэнс у сучаснай рэчаіснасці. Мяркую, што мой час вучобы ва ўніверсітэце — страчаны час. Будучы студэнтам амаль нічога я новага не адкрыў і не даведаўся. Калі я ішоў на беларускую філалогію, выкладчыкі беластоцкага ўніверсітэта зманьвалі мяне і ўсіх, хто паступаў на беларускую філалогію. Асабліва мне, як маладому, наіўнаму паэту прафесары абяцалі залатыя горы. Пасля вучобы я прабудзіўся са студэнцкай эйфарыі „з рукой у гаршку". Жыццё здавалася мне простым і пустым як абяцанкі маіх прафесараў наконт працы. З працай пасля беларускай філалогіі з'явілася моцная праблема. Налазіўся я па фірмах і нідзе выпускнікоў беларускай філалогіі не патрабуюць. На кваліфікацыйных размовах я чуў дзіўныя рэчы ад магчымых працадаўцаў або: *To z takim wykształceniem do Łukaszenki niech idzie.* Напэўна было прыкра слухаць такія словы, але гэта рэальныя гісторыі. Бывала, высылалася 200 мэйлаў з CV, а прасілі на 2-3 размовы на месяц. Хаця такую працу, як я выконваю, можа выконваць чалавек з пачатковай адукацыяй, дык дзякуй Богу маім работадаўцам і за гэта. Потым сустракаў маіх былых сяброў-аднакурснікаў і таксама не мелі яны цудоўнага шчасця або багатых бацькоў. Адзін сябра працаваў шафёрам у магазіне, іншая сяброўка — на пошце. Іншай удалося дзякуючы яе бацьку працаваць у пажарніцтве. Большасць з іх — беспрацоўныя. Потым, бывала, сустракаў я выпускнікоў гісторыі, беларускай філалогіі ці сацыялогіі і фактычна яны мелі амаль такую работу як я, не толькі ў супермаркетах ці гатэлях. Ну, што ж, дзякуй Богу і за гэта, але пра беларускую філалогію мушу больш расказаць. Калі я атрымаў працу, дайшоў да высновы, што мая адукацыя нічога мне не дала — гэта значыць: добрага хлеба. Кажучы папраўдзе, большасць маіх сяброўак ды сяброў вучыліся дзеля атрымання квітка з назвай „магістр". Дзяўчаты мужам варацьмуць абеды ды няньчаць дзяцей, а хлопцы будуюць III Рэч Паспалітую ад фундаментаў да даху. Там заўжды фахманаў шукаюць у гэтай галіне працы. Амаль ніхто з маіх сяброў-аднакурснікаў не лічыў сябе свядомым беларусам, а да мяне, як да беларускага паэта, адносіліся амаль як сяляне да Юрыя Гагарына. Студэнты прапаведавалі тую ж рэлігію „тры разы З": зазубрыць, запамятаць ды забыцца. Думаю, што каб у 2000 годзе замест пачынаць вучобу, я знайшоў фізічную працу тыпу будаўніка ў Бельгіі, дык да сёння больш пабагацеў, а не галадаў пасля пяці гадоў універсітэта. Менавіта так думае большасць маіх равеснікаў, якія закончылі гуманітарныя ўстановы ў Польшчы. Яны мучацца на працах, дзе іх начальнікі маюць сярэднюю або прафесійную адукацыю. Таму зараз выпускнікі ліцэяў, намнога разумнейшыя ад нас, выбіраюць як не эканамічныя ці юрыдычныя, то адміністрацыйныя ўстановы і найлепш як найдалей ад Беластока, у горад такі, дзе менш лічацца знаёмствы, а больш адукацыя, найлепш — у Варшаву. Таму ўсе гуманітарныя напрамкі, а найбольш беларуская філалогія, перажываюць крызіс. Туды ніхто не паступае, таму што гэты напрамак прадукуе шэраг беспрацоўных маладых людзей і не дае ніякіх надзей, каб знайсці працу на Беласточчыне. Кажучы папраўдзе, узровень навучання на беларускай філалогіі вельмі нізкі. Ведаю рэальныя выпадкі, што студэнты, якія не ўмелі нават размаўляць на беларускай мове, атрымлівалі высокія стыпендыі, а пасля заставаліся ва ўніверсітэце як выкладчыкі. Класічным прыкладам могуць быць практычныя заняткі, дзе замест граматычных практыкаванняў ішла пустая і нудная гутарка выкладчыцы са студэнтамі пра ўчарашні серыял або новапрачытаны гараскоп. Гэта жах, але рэальны! Толькі некаторыя выкладчыкі з Беларусі трымалі моцны ўзровень, і на маю думку былі найбольш вартаснымі асобамі, якія я пазнаў у жыцці. Я намнога больш навучыўся, быўшы вучнем Бельскага белліцэя, дзе вучыла мяне *śmietanka* найлепшых настаўнікаў беларускай мовы, якіх я пазнаў у жыцці. Каб трымаць узровень вучобы, я больш займаўся беларускай самаадукацыяй у галіне граматыкі ці беларускай літаратуры з сябрам-беларусам

Юрка БУЙНЮК

Вачыма еўрапейца

Уцякаем адсюль

Па прычыне міграцыі на пастаяннае жыхарства ў іншыя ваяводствы Польшчы, ды галоўным чынам у абсягу таго самога, на працягу найбліжэйшых дваццаці пяці гадоў на Падляшшы будзе пражываць каля 120 тысяч менш насельніцтва чым сёння. Мяркуючы па інфармацыі, сабранай Галоўнай статыстычнай установай (ГСУ), да канца 2009 г., ад 2003 г., значыць, ад даты падпісання ўваходнага трактату аб далучэнні нашай краіны да ЕС, найбольш асоб у Падляшскім ваяводстве выязджае з гмін, у якіх у значнай частцы пражывае беларуская меншасць, а першынство ў гэтым маюць найбольшыя гарады, па чарзе: Бельск-Падляшскі і Гайнаўка. За гэты час мясцовасці Бельскага і Гайнаўскага паветаў пакінула каля дзевяці тысяч мясцовых, галоўным чынам маладых і адукаваных; з Бельшчыны амаль на тысячу больш. З самога Бельска з'ехала больш за 2,2 тысячы, а з Гайнаўкі — каля 2,1 тысячы. Варта тут звярнуць увагу на тое, што інфармацыя ГСУ не да канца згодная з рэальнасцю. Паколькі ГСУ, апрацоўваючы яе, абапіралася толькі на даныя з прапіскі, а выязджаючыя, напрыклад, у пошуках працы ў іншыя, большыя цэнтры проста не выпісваюцца са старога месца жыхарства, толькі часова прапісваюцца ў новым.

Суцяшальным, аднак, можа быць тое, што за апошнія два-тры гады лік асоб з г.зв. групы „міграцыйнага адплыву" ў нашай частцы рэгіёна крыху меншае — па пару дзесяткаў асоб у год. Выключэннем могуць быць Арлянская і Гарадоцкая гміны. Відаць тут адваротную тэндэнцыю; штогод пасяляецца туды больш асоб, хоць, праўда, толькі па некалькі чалавек. У Гарадку прыкметная яна ўжо ад чатырох гадоў (не ўлічваючы 2010 года), а ў Орлі — ад двух. Войт Арлянскай гміны Пятро Сэльвесюк тлумачыў мне:

— Цяжка мне адназначна растлумачыць гэтую з'яву. Мабыць, у сувязі з ранейшымі рашэннямі аб пабудове ў нас прадпрыемства ІКЕА, можа шмат хто рашыўся перадумаць справу выезду. А тыя, хто з'язджае з большых гарадоў, такіх як Бельск ці Гайнаўка, проста чакаюць лепшых стандартаў жыцця, якія ім будуць гарантаваць.

Я спытаўся ў бурмістра Гайнаўкі Анатоля Ахрыцюка, чым тлумачыць аж такі адплыў ліку жыхароў гэтага горада:

— Непатрэбна ўнушаецца, таксама СМІ, такі погляд маладым людзям, што „трэба выехаць". Фармуецца ў іх меркаванне, што па-за Гайнаўкай — іншы свет. Маладыя з'язджаюць, напрыклад, у Беласток на навуку ў вышэйшыя школы, а пасля той горад іх у сябе затрымлівае. Але ведаю таксама, што і маладыя беластачане ўцякаюць у большыя цэнтры. Аказваецца, Беласток таксама для іх не ўмее стварыць адпавядаючых ім шанцаў развіцця. Няма чарадзейнай палачкі, каб гэты працэс адвярнуць. Людзі ад нас уцякаюць, і маем праблемы з адукаванымі кадрамі, са спецыялістамі. Наколькі ведаю, такія праблемы мае нават „Пронар".

Паводле ГСУ ў Беластоку працэс адплыву жыхароў на Падляшшы, між іншым з бяднейшай беларускай яго часткі, генеральна будзе паглыбляцца.

— Аб такім трэндзе рашае ўзровень заробкаў, — сказаў адной з газет аб падобнай сітуацыі на Любліншчыне праф. Андрэй Мішчук з Варшаўскага ўніверсітэта.

Можа ў час набліжаючыхся самаўрадавых выбараў варта пытацца ў кандыдатаў на нашых радных, войтаў і бурмістраў, што намерваюцца з гэтым клопатам рабіць.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

PS. Дзякую спадарыні дырэктар Беластоцкага аддзела ГСУ Эве Камінскай-Гаўрылюк за дапамогу ў зборы матэрыялаў для гэтага тэксту.

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

УЖО ПЯЦЬ ГАДОЎ МАЕМ СВОЙ ЗАКОН

— Гэта, здаецца, адзіны такі закон, якога за пяць гадоў з часу ўступлення ў сілу не папраўлялі, — цешыліся ўдзельнікі канферэнцыі ў Любліне. — Што важна, уведзены ён з амаль усімі неабходнымі выканаўчымі актамі — гэта рэдкасць.

Радасць гэтая, усё ж, здаецца, была больш прымеркаваная да нагоды, а не да сапраўднай сітуацыі, якая кранае меншасці ў Польшчы. Калі задумацца і паспрабаваць падвесці вынікі функцыянавання закону аб нацыянальных і этнічных меншасцях ды рэгіянальнай мове, акажацца, што ёсць там пункты, якія турбуюць, часам нават ускладняюць жыццё меншасцей, а як добра ведаем — ідэалы не існуюць, тым больш у палітыцы. Таму факт прыняцця такога закону ды папярэджваючыя гэты момант шматгадовыя пошукі „залатой сярэдзіны" можам палічыць за поспех. Не адзін удзельнік канферэнцыі падкрэсліваў, што закон гэта доказ жыццяздольнасці і кансенсусу ў польскай палітыцы, а некаторыя дэпутаты дадавалі:

— Быў час, калі нам трэба было пераконваць знакамітую большасць дэпутатаў, што такі закон не пагражае дэстабілізацыяй польскіх межаў.

Ні Сілезія, ні Падляшша, ні іншы рэгіён Польшчы за пяць гадоў не імкнуўся адлучыцца ад польскай дзяржавы, а меншасці, якія сеялі такі страх сярод польскай большасці, зараз лёгка даюцца кантраляваць і ў вялікай ступені залежныя ад законных рэгуляцый. З боку дзяржавы гэта ўжо можа быць сітуацыя амаль ідэальная, але вядома — меншасці непакорныя, што знайшло сваё адлюстраванне ў час канферэнцыі.

Гэтая незвычайная канферэнцыя прайшла 15-17 верасня ў Любліне. Навуковае асяроддзе Універсітэта Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне падрыхтавала яе ў сувязі з пятай гадавінай дзеяння ў Польшчы закону аб нацыянальных і этнічных меншасцях ды рэгіянальнай мове. Люблін выбраны быў невыпадкова, менавіта там 4-5 лютага 1994 года калектыў Хельсінскага фонду правоў чалавека ў складзе Марэк Навіцкі, Андрэй Жэплінскі, Збігнеў Голда і Гжэгаж Януш падрыхтаваў папярэдні праект гэтага закону. На жаль, не ўсе дачакаліся рэалізацыі на практыцы сваёй працы, між іншым таксама Яцак Курань, ініцыятар дыскусіі і заканадаўства наконт меншасцей, але шаснаццаць гадоў пасля Гжэгаж Януш (які запісаўся ў гісторыі прац над законам, прафесар і дэкан паліталогіі люблінскага ўніверсітэта), узяў адказнасць за памяць аб складанай яго падрыхтоўцы ды кшталт юбілейнай канферэнцыі. Можна палічыць гэта поспехам, бо патранат узяў над ёю маршалак Сейма Рэчы Паспалітай Гжэгаж Схэтына, які асабіста адкрыў канферэнцыю. Прынялі ў ёй ўдзел каля 120 панэлістаў, дыскутантаў і гасцей, у тым ліку дэпутаты, чыноўнікі, прадстаўнікі меншасцей ды навукоўцы, паколькі канферэнцыю назвалі навуковай. Безумоўна, дасягненнем было таксама наладжанне ў адзін дзень і ў адным месцы пасяджэнняў Сэймавай камісіі меншасцей ды Супольнай камісіі ўрада і меншасцей. Гэта спрычынілася да адчування сапраўды святочнай атмасферы. Ды калі слухалася ўспамінаў, расказаў, ацэнак, якія амаль два дні ў падобнай форме гучалі ў люблінскіх залах, вярталася пытанне: каму і ці ўвогуле патрэбная такая канферэнцыя. Адказ даў прафесар Януш:

— Варта памятаць, што паміж запісамі і практыкай заўсёды будуць разыходжанні і такія моманты ў Еўропе ці ў Польшчы здараюцца. Таму трэба гаварыць пра недахопы заканадаўства, але і пра яго каштоўнасць, пастаянна аказваць меншасцям увагу.

Канферэнцыя і важнае 5-годдзе былі нагодай, каб шырэй у Польшчы гаварылася пра меншасці. Сумны вынік медыйнага зацікаўлення прынесла аднак прэс-канферэнцыя з маршалкам Схэтынам ды галоўнымі асобамі звязанымі з функцыянаваннем закону. Журналісты пыталіся толькі і выключна пра палітычны лёс маршалка і планы Грамадзянскай платформы. На просьбу мадэратара ставіць пытанні толькі на тэму з'явіліся пытанні наконт з'езда чачэнцаў і важнай, хаця не непасрэдна для Польшчы, французскай дэпартацыі ромаў.

— Гэта прыкра і малавядома звычайнаму чалавеку, але Францыя і Грэцыя ўвогуле не прызнаюць прысутнасці меншасцей на сваёй тэрыторыі, — сказаў прафесар Януш.

Ян Дзідзірыксэн, дзеяч Федэралістычнай уніі еўрапейскіх нацый, падводзячы сваім выступленнем першы дзень канферэнцыі, звярнуў увагу на двайныя стандарты ў Еўропе. Новыя краіны Еўрасаюза маюць жорсткі абавязак уводзіць заканадаўства ахоўваючае правы меншасцей, у час калі старая „пятнаццатка" не мае такога абавязку.

У польскіх меншасцей, аднак, свае праблемы. Каб адназначна агучыліся яны ў час канферэнцыі, пастараліся перад усім сябры Супольнай камісіі ўрада і меншасцей. Засяроджвалася ўвагу перад усім на рэгуляцыі, якія датычаць адукацыі, медыйнай палітыкі ці культуры. Вярталіся праблемы з вышэйшай адукацыяй, пра якую, можна сказаць, у законе забыліся. Вельмі выразна не адзін раз гаварылася наконт талерантнасці і недахопу міжкультурнай адукацыі, неабходнай перш за ўсё там, дзе пражываюць меншасці. Не так лёгка таксама з падручнікамі, якіх не хапае, і якім не спрыяюць міністэрскі працэдуры. І хаця прадстаўнікі Міністэрства нацыянальнай адукацыі гаварылі: „Згодна з законам змест навучання аб меншасцях ёсць зацверджаны і абавязковы ", то паўсюль вядома, што кантроль гэтага абавязку не праводзіцца.

— Ужо сёння ведаем, што, пакідаючы пытанні прысутнасці меншасцей у публічных медыях рэгуляцыі медыйным законам, зрабілі памылку, — гаварылі прадстаўнікі Сеймавай камісіі меншасцей.

Гэта штодзённая праблема меншасцей — змаганне за прысутнасць у СМІ, а як ведаем — у агульнапольскіх выданнях гэта амаль немагчымае. Не кожнае асяроддзе мае магчымасць заснаваць сваю прыватную радыёстанцыю ці тэлебачанне, што зараз здзяйсняецца, напрыклад, у кашубаў.

— Я прапаную ўвогуле памяняць прынцыпы прызнавання частот лакальным і меншасным радыёстанцыям, — сказаў дэпутат Адам Абрамовіч з Права і справядлівасці, які прыватна ў Белай-Падляскай даволі часта слухае Радыё Рацыя.

Адна з многіх ідэй, якая, на жаль, або будзе доўга чакаць здзяйснення, або ніколі не выйграе з медыйным лобі камерцыйных станцый.

Іншая ідэя, якую акцэнтаваў дэпутат Яўген Чыквін, гэта вяртанне кураторства культуры меншасцей з Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі ў Міністэрства культуры. Ды на ніве культурнай дзейнасці меншасці больш цікавіць спрашчэнне фінансавых разлікаў ды прыхільнасць да рэалізацыі шматгадовых, важных праектаў. Але самы важны праект якраз польскай дзяржавы ў бліжэйшы час гэта перапіс насельніцтва. Вынікі перапісу паўплываюць і на культуру, і на штодзённае жыццё меншасцей, што звязана з рэалізацыяй запісаў закону. Семінар наконт перапісу папярэдзіў і пленарныя сустрэчы, і навуковыя сесіі, якія прайшлі ў другі і трэці дзень канферэнцыі. Пытанні наконт перапісу надалей не вырашаны, а барацьба меншасцей за яго выгляд і спосаб падліку вынікаў не спыняецца.

— Звяртаюся з просьбай да ўдзельнікаў канферэнцыі, — заявіў дэпутат Мірон Сыч, — прыняць пазіцыю накіраваную ў Галоўную статыстычную ўстанову, каб перапіс не меў асіміляцыйнага характару.

Сябры Супольнай камісіі ўрада і меншасцей падрыхтавалі аднак сваю пазіцыю, якой прымусілі прысутных прадстаўнікоў польскай статыстыкі вырашыць хаця б кшталт пытанняў аб нацыянальнай і этнічнай тоеснасці (пра гэта будзем паведамляць у чарговых артыкулах наконт перапісу насельніцтва ў 2011 годзе). Поўную пазіцыю статыстыкаў напэўна яшчэ пазнаем.

Канферэнцыя ў Любліне паказала як і дзе ціснуць запісы закону аб нацыянальных і этнічных меншасцях ды рэгіянальнай мове. Закон, аднак, дае акрэсленыя правы, якія на Падляшшы, на жаль, не скарыстоўваюцца. Не хочам дапаможнай мовы ды двухмоўных указальнікаў там дзе можам іх мець, не хочам уводзіць навучання беларускай мовы там дзе гэта магчыма, а гэта адзіны спосаб, каб захаваць беларушчыну нашых дзяцей і ўнукаў, бо нашыя родныя гаворкі ў гарадах расплываюцца. Карыстайма, калі маем такую магчымасць.

Новае Ляўкова

Пікнік для невідучых у „Бора-Здруй”

Невідучыя і слабавідучыя з-за сваёй фізічнай заганы найбольш часу праводзяць самотна і дома. Ім вельмі хочацца пабываць на свежым паветры. Таму Праўленне гуртка Польскага саюза навідучых (ПСН) у Гайнаўцы арганізуе ім пікнікі. Апошнім разам арганізавалі яго ў агратурыстычным аб’екце „Бора-Здруй” Людмілы і Боры Казлоўскіх у Новым Ляўкове Гайнаўскага павета. Прыехала 47 чалавек з Гайнаўкі ды Белавежскай, Гайнаўскай, Дубіцкай і Нараўчанскай гмінаў.

Гасцей прывітаў спадар Барыс. Ён запрасіў у свой скансэн „Вёска даўней”, у якім вельмі многа колішніх сельскагаспадарчых машын і прылад для апрацоўкі зямлі, уборкі збожжа, сеяння, абмалоту і г.д. Стаіць тут дом, у якім ёсць спрадвечнае абсталяванне. У комплексе курортнага аб’екта знаходзяцца і „Лясная галерэя”, вятрак і вадзяны млын. У галерэі поўна лясных звяроў і птушак. З гукаўзмацняльніка плывуць галасы ваўкоў, зуброў, аленяў ды спеў птушак. Як жа гэта цікава для невідучых!

Пасля для ўсіх быў смакавіты пачастунак, кава, гарбата з лімонам ды розныя ахаладжальныя напоі. Затым былі конкурсы з узнагародамі. Вялі іх старшыня гуртка ПСН Януш Пух і сакратар Мікалай Янкоўскі. Усе ахвотна ездзілі яшчэ спецыяльным дыліжансам па маляўнічай ваколіцы праз лес на лугі над рэчкай Баброўкай. Мерапрыемства было цікавае ды незабыўнае. Падчас пікніку яго ўдзельнікі сабралі 200 злотых для пацярпеўшых ад паводкі.

Гайнаўка

Горад будуе вуліцы

Зараз у Гайнаўцы ідуць працы пры перабудове і пабудове вуліц. Закончылі пабудову водасцёкавай каналізацыі ды пракладку асфальту на адрэзку вуліцы Тарговай, на вуліцы Багеннай. Знаходзяцца яны на паўднёва-заходнім рубяжы горада. Вуліца Тарговая перасякае вуліцу Бельскую, якая вядзе ў напрамку Бельска-Падляшскага.

Падрыхтавалі пад асфальт маставыя на вуліцах Спіральнай (яна адыходзіць ад вуліцы Падляссе), вул. Ютшэнкі (ад вул. Врублеўскага), вул. Тапалёвай (ад вуліцы Ліпавай) ды вуліцы Налкоўскай (ад вуліцы Арміі Краёвай). Навезлі і расплянтавалі гравій ды праклалі новыя бардзюры.

Шмат вуліц у Гайнаўцы яшчэ чакае лепшай маставой, але немагчыма ўсё адразу. Бюджэт горада абмежаваны. Ён дазваляе штогод асфальтаваць па некалькі вуліц.

Варта яшчэ, каб самаўрадавыя ўлады ўзялі пад увагу тратуары на адрэзках вуліц 11 Лістапада, Арміі Краёвай, Пілсудскага, Простай і Ягайлы. Яны ўхабістыя і лёгка на іх можна скрунуць нагу.

(яц)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

ЗБУЧ 2010

Няма сумненняў, што за Збучом, Чыжамі, Курашавам, Каменем, Койламі і некаторымі іншымі вёскамі Чыжоўскай гміны стаіць славутае мінулае, маючы на ўвазе як гістарычныя падзеі, так і звычайнае жыццё ў даўніх часах. Пра гэта сведчаць хаця б курганы і могільнікі, раскінутыя па гміне, а і самыя гэтыя сёлы належаць да найстарэйшых у наваколлі. Каб пазнаёміць мясцовае насельніцтва са славутай гісторыяй, трэба было выйсці да яго з нестандартнымі і цікавымі прапановамі. Арганізаванне археалагічнага фэсту на старажытным гарадзішчы побач Збуча было ўдалай задумай, бо такога мерапрыемства з песнямі і танцамі нельга было б наладзіць побач курганоў ці могільнікаў, раскінутых па Чыжоўскай гміне. З гісторыяй гэтых месц трэба знаёміць мясцовых і прыезджых людзей, але ў іншы спосаб, у спакоі і з роздумам аб жыцці ў мінулым. Нават наладжана ўжо сцяжынка археалагічнай адукацыі, што выходзіць з-пад Збуча і ідзе праз Койлы, Курашава і даходзіць у Камень, бо побач гэтых сёл знаходзяцца даўнія могільнікі і курганы. Гмінная ўправа ў Чыжах прапануе, каб паставіць абарончы драўляны плот на частцы насыпу збуцкага гарадзішча, а ўсярэдзіне збудаваць драўляную забудову на лад з далёкага мінулага, але покі не ўдалося раздабыць сродкаў на рэканструкцыю даўняга гарадзішча.

— Не ведаю, ці ў гэтым годзе ўвогуле будзем ладзіць археалагічны фэст побач Збуча. Яшчэ невядома, якія датацыі атрымаем на арганізаванне гэтага мерапрыемства. Сёлета рэалізаваліся ў нашай гміне вялікія інвестыцыі і нам самім не пад сілу будзе ладзіць вялікае археалагічнае мерапрыемства, — заявіў летам войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк. Пасля аказалася, што VIII Археалагічны фэст Збуч-2010, які маршалак Падляшскага ваяводства, войт і Гмінны аяродак культуры ў Чыжах, а таксама Старажытнае аб’яднанне з Варшавы наладзілі 26 верасня ў рамках Еўрапейскіх дзён спадчыны, будзе дафінансаваны заўважальнымі сродкамі з Падляшскай маршалкоўскай управы. Сам маршалак Яраслаў Дважанскі, які прыбыў у Збуч разам з дырэктарам Дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Маршалкоўскай управы Анатолем Вапам, меў раней тэлефанаваць да войта Юрыя Васілюка, ініцыятара мерапрыемства і абяцаць фінансавую дапамогу. Хаця на арганізацыю збуцкага мерапрыемства было ў гэтым годзе менш часу, чым у мінулых гадах, яго прапановы былі цікавымі як для мясцовых людзей, так і для прыезджай публікі, якая шматлюдна прыбыла на археалагічны фэст. Там, дзе яшчэ гадоў дзесяць назад пасвілі кароў, былі расстаўлены сярэднявечныя палаткі, побач якіх сядзелі маладыя людзі пераапранутыя за рыцараў і іх сямейнікаў. Сам Збуч гэта таксама сяло з прыстойным выглядам, а ў частцы вёскі распаложанай паабапал шашы Гайнаўка — Бельск-Падляшскі будаваліся і будуюцца новыя дамы, а таксама рамантуюцца старэйшыя хаты. Зручна ж адсюль даязджаць на працу ў Бельск-Падляшскі і Гайнаўку, а вакол згаданай забудовы распаложаны вельмі якасныя сельскагаспадарчыя ўгоддзі. Калі праязджаю праз гэтую частку сяла, неяк спазіраю на прыгожа адрамантаваны аўтобусны прыпынак і ўспамінаецца мне выкананы раней спрэям вялікі надпіс на мураванай сцяне „Жыве Беларусь”, які быў прыкрыты дошкамі ў час рамонту прыпынку. Пра беларускую нацыянальную свядомасць у Чыжоўскай гміне сведчаць цяпер вынікі апошняга перапісу насельніцтва, у час якога звыш васьмідзесяці працэнтаў жыхароў назвала сябе беларусамі і амаль стопрацэнтная прысутнасць вучняў Падставовай школы і Гімназіі ў Чыжах на занятках беларускай мовы ды беларускія калектывы „Чыжавяне”, „Незабудкі” і „Збучанкі”, якія ўдала выступілі ў час археалагічнага фэсту. Зоркай мерапрыемства была „Чарамшына”, але публіку зацікавілі таксама калектывы „Луна” з Парцава, „Метра” з Гайнаўкі, у якім выступаюць выпускнікі белліцэя, ці „Маланка” і „Куранты” з Бельска-Падляшскага.

Адзін з галоўных атракцыёнаў фэсту састаўляюць змаганні рыцараў. У гэтым годзе прыбылі яны з Беластока, Супраслі і іншых гарадоў. Покі дайшло да вялікага змагання, вядучы доўга расказваў пра вопратку рыцараў, іх зброю, дэманстраваліся паасобныя спосабы змагання з прымяненнем мячоў, кап’я ці тапароў. Гэтай прэзентацыяй, а пазней вялікім лупцаваннем зацікавіліся не толькі дзеткі і моладзь, але большасць сабраных на гарадзішчы. Наведвальнікі археалагічнага фэсту мелі нагоду паглядзець таксама на кавальскія вырабы падобныя на прылады працы з мінулага.

— Ёсць надзея, што атрымаем сродкі на рэканструкцыю часткі абарончай забудовы на насыпе, побач брамы, дзе вяліся ўжо археалагічныя раскопкі, — заявіў дырэктар Гміннага асяродка культуры ў Чыжах Юрый Якімюк. Калі б такое адбылося, больш шматлюдна наведвалі б гарадзішча турысты, што пастаянна праязджаюць побач яго, едучы ў Белавежу.

У час мерапрыемства можна было таксама паспрабаваць мясцовыя вырабы харчавання, напрыклад, розныя каўбасы, сыры ці аладкі, якія прадавалі людзі з навакольных і больш аддаленых мясцовасцей і паесці ў сучасным буфеце. У час збуцкіх фэстаў я раней ніколі не бачыў такой вялікай колькасці прапанаваных вырабаў прадуктовага і прамысловага характару, бо працавітыя людзі з Гайнаўшчыны і прыезджыя асобы прапанавалі таксама купіць іх рукадзелле. Наймалодшыя гулялі ў дзіцячым гарадку і маглі паглядзець на тэхніку пажарнікаў і пагранічнікаў. Старэйшым удзельнікам фэсту прапанавалася кідаць хамут на адлегласць. Каб такія гульні пабачылі ў мінулам нашы дзяды ці прадзеды, далі б жару свавольнікам, якія маглі б знішчыць дарагі хамут! Зараз, калі нават не ў кожнай вёсцы ёсць прынамсі адзін конь, хамуты страцілі сваю вартасць і кіданне іх лічыцца цікавым атракцыёнам.

Родам з Беласточчыны

Пра Арла і Коршуна

Сяргей ЧЫГРЫН

Сёлета спаўняецца 120 гадоў з дня нараджэння двух беларускіх паэтаў, якія былі родам з Беласточчыны — М. Арла (Сцяпана Пятэльскага) і Коршуна (Янука Дарашкевіча). Жыццём і творчасцю іх некалі займаўся кандыдат філалагічных навук, вядомы беларускі літаратуразнавец Янка Саламевіч. Ён нават у 1991 годзе сабраў спадчыну М. Арла і выдаў асобнай кніжачкай пад назвай „Лірнік". А вось паэтычную спадчыну Янука Дарашкевіча пакуль выдаць не ўдалося. Пра Арла і Коршуна я вырашыў сёння пагутарыць з Янкам Саламевічам.

— Спадар Янка, чаму Вы пакрыўдзілі сябрука Сцяпана Пятэльскага Янука Дарашкевіча і не выдалі яго паэтычную спадчыну, так як зрабілі з Пятэльскім (М. Арлом)?

— Гэта я табе, Сяргей, прапаную зрабіць. Тым больш, што ты ўжо сёетое з яго паэтычных твораў сабраў, шмат надрукаваў добрых згадак пра Янука Дарашкевіча. Ведаю, што ў бліжэйшы час ты будзеш яшчэ працаваць у бібліятэцы Акадэміі навук Літвы. А там у фондзе № 21 захоўваецца яго рукапіс зборніка „Абразкі". Таму што „Абразкі" я там бачыў, але не змог у свой час іх перапісаць.

— Можа так і назваць зборнік Янука Дарашкевіча: „Абразкі"?

— Гэту назву выкарыстоўваць нельга, бо такую назву меў адзін са зборнікаў лірычных імпрэсій Змітрака Бядулі, які выходзіў з друку ў 1913 годзе ў Пецярбургу. Назву яму тады падказаў Янка Купала. Ды да зборніка вершаў такі назоў не падыходзіць. Ён больш падыходзіць да кнігі прозы.

— Усё ж у М. Арла больш захавалася твораў, чым у Янука Дарашкевіча?

— Усё, што давялося мне знайсці пра М. Арла, увайшло ў ягоную кнігу „Лірнік". Рукапіс „Лірніка", на шчасце, давялося мне займець. Ды і Пятэльскі больш друкаваўся за Дарашкевіча. У Сцяпана Пятэльскага было напісана і знойдзена каля 50 вершаў, перакладаў з В. Бялінскага, карэспандэнцый розных, якія ён падпісваў псеўданімам С. Бас. У Янука Дарашкевіча напісана каля 20 вершаў. Ён карыстаўся псеўданімамі Коршун, В. Каршун, Янук Д., Д-іч Янук.

— А Сцяпан Пятэльскі меў толькі псеўданімам М. Арол і С. Бас?

— Быў у яго і крыптанім М.А. Але найбольш падпісваў свае творы ён псеўданімам М. Арол. Алег Лойка ў сваёй „Гісторыі беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд" (Т. 2) абазваў М. Арла Мікалаем. Але той так ніколі не падпісваўся. Услед за Лойкам, Пятэльскага Мікалаем неяк называла і „Ніва" ў Беластоку.

— А чаму гэтыя беластоцкія беларускія хлопцы пабралі сабе птушыныя псеўданімы?

— Нават і не ведаю. Ды гэтага, думаю, не ведае ніхто.

— Творчасць М. Арла даследавалі Юры Туронак, Вы, Алег Лойка, Віктар Швед, згадвалі пра яго Яўхім Карскі, Максім Гарэцкі і іншыя літаратары. Пры падрыхтоўцы кнігі твораў М. Арла, Вы перапісваліся з ягонымі сваякамі?

— Пры падрыхтоўцы „Лірніка" М. Арла я не перапісваўся з яго сваякамі. Ды іх, відаць, ужо і не было, як казалі беластоцкія журналісты. Хаця, магчыма, далёкія продкі Пятэльскага жывуць у Гарадку.

— Нядаўна мне заснавальнік літаратурна-краязнаўчага музея ў Гудзевічах Алесь Белакоз даслаў паэму „Чаму ж усыхаюць кветачкі польскія на гною беларуска-літоўскім?", якую напісаў М. Арол. Але гэта паэма не была ўключана ў зборнік „Лірнік". Чаму?

— Я ведаю гэту паэму. Яе сапраўды напісаў М. Арол. Але гэта іншы Арол, а не Пятэльскі-Арол. Паэма М. Арлом была напісана ў 1921 годзе ў Лідзе. А, як мне вядома, беластоцкі М. Арол, як пісала віленская „Крыніца", памёр у 1917 ці ў 1918 гадах на Украіне з тыфусу, маючы 28 гадоў ад роду.

— Але спадар Алесь Белакоз мяркуе, што аўтар вышэй названай паэмы, не хто іншы, а менавіта Сцяпан Пятэльскі. І памёр ён не ў 1917 ці 1918 гадах, а значна пазней. М. Арол, па словах Алеся Белакоза, загінуў напачатку 1920-х гадоў, магчыма ў Латвіі. Родныя яго людзі ведаць не маглі, бо яны не вярнуліся яшчэ з бежанства, а таму былі аддзелены мяжой ад Беларусі і Латвіі. Ды і тая віленская „Крыніца" паведаміла пра смерць М. Арла не калі-небудзь, а менавіта ў 1925 годзе.

— Пры падрыхтоўцы спадчыны М. Арла, мне падобныя факты не траплялі. А каб даказаць на 100% версію Алеся Белакоза, трэба яшчэ шмат перакапаць архіваў і дакументаў.

— Спадар Янка, а як насамрэч склаўся лёс Янука Дарашкевіча?

— На вялікі жаль, Янук Дарашкевіч жыў у Расіі і ад сваёй беларускасці адмовіўся. Ён, як вясковец, загінуў на фронце Другой сусветнай вайны 24 лютага 1943 года ў Арлоўскай вобласці. Ды і архіў яго не захаваўся.

— Тым не менш, Сцяпан Пятэльскі і Янук Дарашкевіч з'яўляюцца аднымі з пачынальнікаў нашай беларускай літаратуры.

— Так. Іх смела можна называць пачынальнікамі новай беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя, пачынальнікамі шчырымі і таленавітымі. І памяць пра іх у нашым народзе павінна быць дзейснай і жывой. Іх літаратурная спадчына служыць нашай літаратуры, беларускай культуры. Яна — яшчэ адна цаглінка, выкладзеная ў падмурак беларускага прыгожага пісьменства яшчэ разам з Янкам Купалам і Якубам Коласам. І добра, што сёння ў год іх 120-годдзя мы зноў гэтых паэтаў прыгадалі.

Янка Саламевіч

Янук Дарашкевіч

Фота Міры Лукшы

Сцяпан Пятэльскі (бюст Алеся Ліпеня)

Кандыдаты на прэзідэнта

Цэнтрвыбаркам на пасяджэнні 27 верасня разгледзеў заявы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта Беларусі. Зарэгістраваны ўсе прэтэндэнты акрамя санітаркі Наталлі Старыкавай і беспрацоўнага Ілы Дабратвора з Мінска.

Першымі былі разгледжаны заявы санітаркі водалячэбніцы санаторыя „Чонкі" з Гомельскага раёна Наталлі Старыкавай і беспрацоўнага Ілы Дабратвора з Мінска. Абодвум у рэгістрацыі адмоўлена: у Старыкавай у ініцыятыўнай групе ўсяго 30 чалавек замест неабходных паводле закону 100, у Дабратвора — адзін; акрамя таго, яму няма 35 гадоў (1981 года нараджэння).

Зарэгістравана ініцыятыўная група лідара грамадзянскай кампаніі „Гавары праўду!" Уладзіміра Някляева. За рэгістрацыю прагаласавалі восем членаў ЦВК, супраць — тры.

ЦВК таксама зарэгістравала ініцыятыўныя групы намесніка старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Яраслава Раманчука і першага намесніка старшыні Беларускай партыі „Зялёныя" Юрыя Глушакова.

Прынята рашэнне аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы старшыні аргкамітэта па стварэнні саюза „За мадэрнізацыю" Алеся Міхалевіча.

Зарэгістравана ініцыятыўная група дырэктара ТДА „Трывіум" Дзмітрыя Уса.

ЦВК тасама зарэгістравала ініцыятыўную групу лідара руху „Еўрапейская Беларусь" Андрэя Саннікава.

Услед за гэтым прынята рашэнне аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы намесніка старшыні Партыі БНФ Рыгора Кастусёва.

Меркаванні членаў ЦВК аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы лідара Ліберальна-дэмакратычнай партыі Сяргея Гайдукевіча раздзяліліся. У выніку дзевяць членаў камісіі выступілі за рэгістрацыю групы, два — супраць.

Прынята таксама рашэнне аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы сустаршыні аргкамітэта па стварэнні партыі „Беларуская хрысціянская дэмакратыя" Віталя Рымашэўскага.

Дзесятай па ліку зарэгістравана ініцыятыўная група дзейнага кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі.

ЦВК таксама зарэгістравала ініцыятыўную групу лідара аргкамітэта па стварэнні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікалая Статкевіча.

Пасля гэтага была зарэгістравана ініцыятыўная група беспрацоўнага з Мінска Сяргея Іванова. Супраць рэгістрацыі групы прагаласаваў адзін член ЦВК.

Зарэгістравана таксама ініцыятыўнага група Івана Кулікова, супрацоўніка Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў „Сосны".

Пасля гэтага ЦВК разгледзела заяву інжынера-будаўніка Пятра Барысава, прыняў станоўчае рашэнне.

Прынята рашэнне аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы індывідуальнага прадпрымальніка з Віцебска Уладзіміра Правальскага.

Апошняй зарэгістравана ініцыятыўная група Сяргея Рыжова, начальніка сектара знешнеэканамічнай дзейнасці ААТ „Віцебскі плодаагароднінны камбінат".

Паведамляе БелаПАН

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Юльян Тувім

Гародніна

Кухарка прынесла дахаты
Цыбулю,
Капусту,
Пятрушку,
Таматы,
Бульбу,
Салату,
Бурак
і гарох...
Ох!
Прынесла кухарка,
А ў кошыку сварка:
Хто з іх мацнейшы,
Зграбнейшы,
Смачнейшы
І разумнейшы —
Цыбуля?
Капуста?
Пятрушка?
Таматы?
Бурак
Ці гарох?
Ах!
Накрычаліся аж страх!
А кухарка іх на стол,
Ножыкам — чах!
Пакрышыла,
Перамыла
Цыбулю,
Капусту,
Пятрушку,
Таматы,
Бульбу,
Салату,
Бурак
Ды гарох —
і ў гаршчок!

У верасні ў садку

Фота Ганны Кандрацюк

Пяцігодкі і шасцігодкі з настаўніцай Эвай Гняздоўскай і спадарыняй Аннай Раманюк

— Дзеткі, ведаеце што значыць слова *зорка?* — спытала я ў беластоцкіх дашкольнікаў, якія сабраліся пад насценнай газетай „Восень", каб зрабіць здымак.

Сярод пяцігодкаў і шасцігодкаў запанавала маўчанне.

— Я ведаю! — адазваўся адзін хлопчык.

— Ну, скажы Кандрат, — заахвоціла яго пані Эва.

— Зорка гэта... гэта... — хлопчык не мог знайсці польскага слова, — гэта, калі свеціцца на небе!

Пасля, адазваліся іншыя галасы: „гвяздка! гвяздка! гвяздка!".

— А можа ведаеце вершык або песню пра зорку?

— Таааааак! — пачулася ў адказ.

Дзеткі з беларуска-польскага прадшколля любяць спяваць і дэкламаваць вершы. Гэта натхніла настаўніц, каб напісаць ім мастацкі праект пад загалоўкам „Гарэзлівыя паравіны года". У ім спалучаць ігру жывога акцёра і тэатр ценяў, а сцэнарый для п'есы напіша нашая паэтка Міра Лукша.

* * *

Калі восеньскай ранічкай мы завіталі ў беластоцкі садок, шасцігодкі і пяцігодкі малявалі лісты клёну і каштанаў. Іншыя рашалі задачы з кніжкі або малявалі карцінкі. Творчы настрой і засяроджанасць перакліканіся з каляровымі дрэвамі і кветкамі за акном.

— А як выглядае прысутнасць? — спыталі мы. Як вядома, увосень амаль усе дзеткі хварэюць на грып, ангіну або звычайную прастуду.

— Ужо пачалося, — кажа Эва Гняздоўская. — Сёння няма дзесяці асоб. Пасля будзе яшчэ горш. Ну, але такое мусова перацярпець...

У беларускіх аддзелах займаецца 88 дашкольнікаў. Не ўсе ахвотныя могуць вывучаць беларускую мову.

— Дзесяць дзяцей чакае ў чарзе, — кажа дырэктар Луцыя Неміровіч. — Пасля, калі звольняцца месцы, прыпішам іх у беларускія групы.

Гаспадыня распавяла нам пра новыя ідэі:

— З гэтага года пачнем еўрасаюзны праект „Шанс на лепшы старт". Яго мэтай будзе пазнаёміць дзяцей з мультымедыйнай тэхнікай і асновамі журналістыкі. У нас свая газетка і тут на месцы мы можам практыкавацца. Дзеці будуць маглі раз у тыдзень размаўляць з бацькамі па скайпе.

Як раней, у садку працуюць музычны гурт „Вясёлка" (пад кірункам Анны Бабік і Дануты Тымашэвіч), мастацкі гурток (вядуць яго Эва Гняздоўская і Эля Баравік) ды курсы гульні ў шахматы. Заняткі па шахматах арганізаваны для ўсіх пяцігодкаў і шасцігодкаў.

— Мы адзіны садок у Беластоку, дзе ўсе дзеткі займаюцца гульнёй у шахматы, — адзначае з гонарам пані дырэктар. Раней за ўрокі трэба было плаціць грошы. Зараз іх увялі як праграмную навінку ды кожнае дзіця праходзіць бясплатныя курсы шахматаў на ўроках. Заняткі па шахматах у беларуска-польскім садку вядуцца з 2004 года. Зараз вядзе іх Уршуля Ярэмішын.

Калі хто пераступіць браму садка, зверне ўвагу на дбайнасць і парадак вакол будынка. Ля сходаў паставілі пад'езд для інвалідаў. Спакушае і пляц з каляровымі арэлямі і трампліны, дзе ў сонечныя дні гуляюць вясёлыя дашкольнікі.

ЗОРКА

Фота Ганны Кандрацюк

Вочы джунглі

(легенда племя сатэрэ-маўэ)

У адной вёсы сатэрэ-маўэ (Satere-Maue), ля ракі Амазонкі, жылі муж і жонка. Усё што нажылі і прыдбалі аддавалі іншым. Аднапляменцы іх шанавалі і любілі. У сямейкі не было дзетак. Бацька і маці кожны дзень прасілі ў бога Тупы, каб той злітаваўся і паслаў ім нашчадка. Ішлі гады, бацькі старэлі. Але ніколі не пакідалі надзеі. У рэшце рэшт іх малітвы былі выслуханы. На свет з'явіўся прыгожы сынок. Ад малога ён размаўляў са звярынай, навучыўся спяваць так як розныя птушкі, патрапіў перахітрыць разумных вужоў. Малы займаўся лекаваннем людзей і звяроў. Дастаткова было, каб дакрануўся да хворага месца і яно пачынала дыхаць, здаравець. Хлопец, так як яго бацькі, любіў дапамагаць іншым. Для кожнага чалавека ён меў добрае слова і адпаведны падарак. Людзі дзякавалі богу Тупу за нябеснага пасланца. Але, як кажуць, ніколі і нідзе не можа быць надта соладка! У джунглях жыў злы дух Юрупуры. Ён зненавідзеў добрага хлапчыну за яго ўчынкі і ласку. Аднойчы, калі дзіця пайшло ў джунглі па плады, Юрупуры прытварыўся ядавітай гадзюкай і смяртэльна параніў малога. Вечарам бацькі і суседзі пайшлі шукаць дзіцяці. Калі яны знайшлі мёртвага сынка, плакалі і доўга маліліся. Ніхто не хацеў змірыцца з яго смерцю:

http://olhares.aeiou.pt/

— Такое мог зрабіць адзін Юрупуры, — шапталіся ў вёсцы. — Вуж не зрабіў бы ім такога. Хлапец умеў гаварыць з вужамі, не баяўся іх.

Разам з бацькамі і вяскоўцамі засмуткаваў добры бог Тупа. Ён пусціў з неба маланку, а пасля прамовіў да маці дзіцяці:

— Дам табе яшчэ адзін падарунак. Толькі спачатку дастань з галавы вочы малога і закапай іх у зямлю...

Жанчына паслухмяна выканала загад бога Тупы.

У адказ вырасла цудоўная расліна з пладамі, якія напамінаюць людскія вочы. Людзі з племя сатэрэ-маўэ назвалі яе гуаранай — так на іх мове кажуць пра „вочы". З таго часу гуарана дапамагае на ўсякія хваробы і немачы. Яна мае ўсе вітаміны і кафеін. У цэлым свеце вядомая кока-кола з гуаранай. Жыхары бразільскага племя сатэрэ-маўэ, якое лічыць толькі 14 вёсак (да 700 жыхароў), рыхтуюць з гуараны напітак „сапо". Яны вераць у магічную моц напою, наліваюць яго ў адну тыкву, а пасля распіваюць згодна з рухам сонца, пачынаючы ад найстарэйшага члена роду. Сатэрэ-маўэ вераць, што рытуал наклікае шчасце ў каханні і поспех у бізнесе. Найбольшым скарбам племя лічыць дзяцей.

ЗОРКА

http://marieelinedevaux.unblog.fr

Тэкля і Прузя

Верныя Міры ЛУКШЫ

Мае Тэкля сяброўку Еўфрасіньку.
І абедзве разам правяць імянінкі.
Хоць кампанія абедзвюм удалася,
Тэкля з Прузяй!" — так жартуюць з іх у класе.
Адчуваюць яны сябе адмыслова:
Бо ж Юстынак і Паўлінак тут палова,
Аняў пяць, Наталек тры, тры Касі...
Колькі Тэкляў на ўвесь горад? — Больш няма.
Еўфрасінняў? — На ўвесь горад я адна!
Вось далі нам класныя імёны тата з мамай.
Бо не штука называцца ўсім таксама.

Музыка з кайфам

На барыкады з насарогам

Сёння зноў павандруем у Гайнаўку. Не будзе гэта сонны канцэрт, ні мая туга па родным горадзе. Не будзе гэта таксама сустрэча з беларускім героем, але затое ў цэнтры будзе стаяць музычны бунт. Ёсць такія ветэраны музычнай сцэны, якія бунтуюцца ўжо амаль дваццаць гадоў і не пакідаюць зброі. На шчасце іх зброяй з'яўляюцца слова ды музыка. Словы піша Войця, а музыкай займаюцца ўсе разам: Войця, Кляўдзі ды Ракось. Трох мушкецёраў герба „Блакітны насарог".

Гурт узнік на пачатку 1990-х гадоў. Як можна дадумацца, склад прынамсі пару разоў мяняўся, але ўсё ж такі характар музыкі захоўваецца, што здзяйсняецца ў формне чарговых альбомаў. Першую аўдыёкасету запісалі дзякуючы ўзнагародзе публікі на фестывалі ў Кельцах у 1993 годзе. Пачалі больш канцэртаваць і здабываць аматараў сваёй музыкі. Пятнаццаць гадоў таму панк і панк-рок мелі яшчэ шмат фанатаў. Было гэта рэха супраціву 1980-х гадоў, а пасля музычны рынак пачаў мяняцца і стаў патрабаваць іншых жанраў ды выканаўцаў. Такія як „Błękitny Nosorożec", хаця не



круцяцца на плэйлістах папулярных радыёстанцый, увесь час бачаць несправядлівасць, нянавісць і крыўду, якой шмат навокал і пра гэта ў сваіх песнях шчыра распавядаюць у рытме панка ці рэгі. Сёння прэзентуюць ужо свой пяты альбом. „Барыкады" гэта чарговая частка аповесці пра тое, з чым няварта згаджацца, затое трэба ўголас крытыкаваць. Не наракаюць на брак фанатаў, сярод якіх і аднагодкі, і моладзь, якая толькі што пачынае бунтавацца. Такія маладыя людзі знаходзяць з музыкамі „Блакітнага" супольную мову.

Спяваюць па-польску, але неаднойчы выступалі на адной сцэне з беларускімі гуртамі. У Гайнаўцы бывала гэта нармальнасцю. Таксама не баяцца новай публікі, таму прэзентаваліся наведвальнікам „Басовішча". Праўду кажучы, часам, нават калі не разумееш слоў, самой энергіі і эмоцыі дастаткова. Хто хоча ўсё ж такі даведацца як і пра што спявае „Блакітны насарог", заахвочваю пераадолець іх новыя „Барыкады".

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 40

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 36:

Кумір, музыкант, салата, ар, Рым, бас. Кусты, муза, мыла, Ікар, брат, нага, кот.

Узнагароду, запісную кніжку, выйграла **Юстына Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



УВАГА КОНКУРС

XIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група**: дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група**: астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, набраныя на камп'ютары або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 84** з прыпіскай на канверце: XIII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **15 лістапада 2010 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў снежні 2010 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Конкурс праводзіцца дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

Спявалі ў музеі

Агляд фальклорных калектываў з Падляшскага ваяводства адбыўся 12 верасня ў Беластоцкім музеі вёскі каля Асовічаў пад Беластокам. У аглядзе прыняло ўдзел больш за дваццаць фальклорных калектываў з Бельска-Падляшскага, Гарадоцкай, Чыжоўскай, Чаромхаўскай, Манецкай, Лапскай, Нараўчанскай, Сакольскай і Супрасльскай гмінаў. У перапынках выступалі прадстаўнікі Падляшскай сельскагаспадарчай палаты, арганізавалі конкурсы з узнагародамі.

Журы конкурсу на цэнтральны агляд кваліфікавала калектывы „Чыжавяне" з Чыжоў ды „Кондзельніцы" з Ясвілаў ды салістку з „Маліннік". Вылучэнні атрымалі „Славяначкі" з Чаромхі, „Зараніца" з Крынак, „Цаглінкі" са Старога Ляўкова і „Навіна" з Мельніка. Віншуем!

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

З роднай песняй

Гутарка са Сцяпанам КОПАМ, музычным дзеячам і збіральнікам народнай спадчыны.

фота Аляксандра Вярбіцкага

— Нарадзіўся Сцяпан Копа...

— 2 кастрычніка 1945 года ў Малінніках Арлянскай гміны Падбеленскага прыхода...

— у сялянскай сям'і. Мнагадзетнай?..

— Трое нас было — яшчэ сёстры: старэйшая Аня і малодшая Вера.

— Калі пачала Вас захапляць музыка?

— Спяваў я з дзяцінства. Ужо ў першым класе стаў я салістам — так назваў мяне загадчык малінніцкай школы Юзаф Монсюль. Настаўніца Надзея Валасовіч, родам з Кашалёў, якая навучала спевам, заўважыла маю радасць спявання, маю сцэнічную смеласць. Асабліва падабалася песня са словамі „Гарні-гарні бульбу з печы, у торбачку і на плечы. Гарні-гарні ды нясі, толькі болей не прасі".

— Гэта вакальны бок музыкі. А як пачалася прыгода з інструментамі?

— У мяне зацікаўленне музыкай з дзяцінства, бо і мама прыгожа спявала, і тата меў цудоўны тэнар. І ў нашай вёсцы ад вякоў-правякоў спявалі, у сваіх групах, на лавачках. Збіраліся не толькі ў святочныя дні, але і ў працоўныя, калі вярталіся ад жніва ці іншых палявых работ, пасля цяжкай працы; я ж таксама яшчэ сярпом жаў. Але людзі радаваліся і ўзаемна неслі сабе радасць. А ў кампаніі, як я заўважаў у старэйшых людзей, былі такія здольныя вакалісты, якія спявалі на некалькі галасоў — умомант ладзілі многагалоссе. Усё, што было звязана з музыкай, з песнямі, цікавіла мяне, я прыглядаўся і прыслухоўваўся. А калі бывалі ў нас забавы, дзе іграли Уладзімір Мураўскі з Орлі ці Вася Шэранос з Тапароў, ці іншыя, то я ўвесь час прыглядаўся, як гэта яны пальцамі перабіраюць, як правай рукой, левай... А калі вечар прыходзіў і бацькі гналі мяне дахаты, то я адчыняў акно і надалей слухаў — пляцоўка была акурат насупраць нашай хаты.

Аднойчы зяць Монсюля прыехаў у нашу вёску і прывёз гармонік на продаж. Цудоўна той гармонік звінеў; як ён мне зайграў, то я думаў, што перада мною нябёсы адкрываюцца. І бацька пытае мяне, ці я хачу іграць. Адказ быў вядомы: абавязкова. Але ў нас грошай не было, бедна мы жылі. А прадавец запрасіў 2 300 злотаў — вельмі дорага як на той час. Пайшоў бацька па вёсцы пазычаць грошы ў сямейнікаў. І восенню, калі ўжо гаспадарчыя работы скончыліся, паехаў ён у Голдап на высечку лесу, каб зарабіць грошы і аддаць людзям. Я навучыўся іграць толькі правай рукой, а левай не даю рады — ну, хто ж меў мяне на вёсцы навучыць? Прыехаў бацька на Руздво і кажа: „Сынок, зайграй". А я левай стараной не ўмею. „Ах, ты такі-сякі, то я там у лесе цяжка працую!.." То я так узяўся, што праз тыдзень часу авалодаў ігру і левай рукой. Не забуду сваёй першай забавы, калі ў 1960 годзе я іграў у Шарнях: цалюткая святліца забітая моладдзю. І якая гэта радасць, калі маладыя людзі, і старэйшыя, прыходзяць з гасціны пад хмяльком, і радасна танцуюць пад маю музыку. З таго часу пачалося маё музыкаванне па забавах, па вяселлях. Пазней дайшоў яшчэ да мяне Уладак Сахарчук, сын Надзеі Сахарчук, ад якой я пасля запісаў мноства нашых мясцовых песень. Ягоны бацька Аляксей зрабіў бубен з сабачай шкуры, бо яна наймацнейшая. Бубніў на ім ягоны сваяк Валодзя Баршчэўскі, бралі таксама іншых.

Вучыўся я самастойна, са слыху. Пасля, у Бельскім белліцэі, іграў у духавым аркестры, на тэнары, але ў аркестры толькі некалькі гукаў трэба рытмічна ў свой час зайграць. А ноты пазнаў толькі ў настаўніцкай студыі, у Беластоку, дзе вучыўся ў 1963-65 гадах. Я там не ведаў ніводнага ні рэстарана, ні кавярні, толькі ў кожную вольную хвіліну браў гармонік на плечы і хадзіў у школу, дзе знайшоў сабе прытульны куточак, і там увесь час практыкаваўся.

У 1965 годзе наступае час першай працы. Інспектары асветы набіралі людзей з музычнай адукацыяй, а нямнога такіх было. Намовілі мяне ў Барглаў, у Аўгустоўскім павеце. А я вельмі люблю прыроду, быць над вадою, над возерам. У той час прыехаў і інспектар з Гайнаўкі і давай мне тлумачыць, каб я не ішоў у чужыя месцы: „Прыходзь на нашу зямлю, на Гайнаўшчыну, мы патрабуем маладых людзей". І даў мне працу ў Трасцянцы. Былі праблемы, бо ж чакалі мяне ў Барглаве, там дырэктар усё нарыхтаваў, але інспектары неяк дагаварыліся і я стаў на працу ў Трасцянцы. Там працаваў вельмі паспяхова тэатральны калектыў.

Шмат працы давялося ўкласці ў тамашні дом культуры, што быў поруч з пажарным дэпо. Не было ў ім ні падлог, ні столі. Нават печка не адводзіла дыму — такія майстры былі звонку, што замуравалі ўсярэдзіне дымаход; пасля трэба было яе раскідаць і мясцовыя печнікі зрабілі так як трэба. Арганізаваў я транспарт драўніны з гайнаўскага тартака — ездзілі фурманкамі. Пад навагодняе святкаванне быў згоджаны аркестр з Гайнаўкі. Разгулялася мяцеліца, таго аркестра няма, моладзь зышлася, білеты прадаюцца... Я паехаў па аркестр, а тыя музыкі ў забягалаўцы, таргуюцца са мною. Давялося плаціць ім уласнымі грашыма за іх іграннe на забаве, каб людзям прынесці радасць.

Коля Матэйчук, дырэктар Гарадоцкага дома культуры, і Ян Бараноўскі, дырэктар тамашняй школы, прыехалі ў 1967 годзе ў Трасцянку і заагітавалі мяне ў Гарадок. Там трэба было рэактываваць калектыў, які раней арганізавала Ніна Мушынская — вёў я яго да 2002 года. Працаваў я і ў школе, дзе таксама вёў хор — цудоўны быў гэта хор. Быў хор, было некалькі вакальных груп, інструменталісты: акардэаністы, мандаліністы, гітарысты. За сем гадоў маёй працы ў гарадоцкай школе, з 1967 да 1974 года, уся сцяна была абвешана дыпломамі за музычныя поспехі. У 1972 годзе я атрымаў узнагароду міністра асветы — я быў там адзіным настаўнікам музыкі. Я стаяў тады побач Рыгора Анаціка, настаўніка фізікі з майго Бельскага белліцэя. Гэта быў выдатны настаўнік, дасканалы чалавек; ён умеў так цудоўна, так лагічна пераказваць веды. Стаяць там побач яго было для мяне вельмі вялікім гонарам.

— У гарадоцкай школе Вы былі да 1974 года. А пасля?

— Я ўжо ў 1970 годзе ажаніўся і жончыны бацькі, якія ўжо думалі пра старасць, запрапанавалі нам пасяліцца разам з імі ў Гараднянах. Я атрымаў працу ў беластоцкай школе № 6, а жонка яшчэ два гады даязджала ў Храбалы пад Кнышынам, а пасля атрымала працу таксама ў Беластоку. У Гарадок я з таго часу даязджаў адно на рэпетыцыі хору. З 1983 года па-

Сцяпану Копу 65 Віншуем!

чаў весці хор у Беларускім таварыстве — да 1992 года.

— Куды давялося ездзіць з падапечнымі калектывамі?

— Былі некалькі разоў у Сопаце, некалькі разоў у Варшаве, у Вэнгажэве, у Казімежы, у Ждыні на лэмкаўскай „Ватры". У Ждыню паехалі тры нашы калектывы: Беласток, Гарадок і „Хлопцы-Рыбалоўцы", якіх я таксама вёў з 1988 да 1992 года. Было бадай пяць песень, якія былі развучаны гэтымі ўсімі калектывамі, з якіх атрымаўся вялікі хор. Запрашалі нас на чарговыя сустрэчы, але ж у Ждыню і далёка, і дорага. З Гарадком прымалі ўдзел у „Вясельнай бяседзе" ў Вэнграве.

Бывалі ў Беларусі: у Мінску, у Гродне, у Вузлах над возерам Нарач, у Свіслачы, у Бераставіцы, у Бубнах на Вілейшчыне, у Іўі з „Хлопцамі-Рыбалоўцамі" і тэатральнай групай з Паўлаў, у 1994 годзе ў Пінску. Сам быў некалькі разоў у Мінску на кароткіх курсах для арганізатараў беларускай культуры.

— Ці ў ліку Вашых падапечных ёсць такія, якія выплылі на шырокія музычныя воды?

— Я вучыў у школах і ёсць мае былыя вучні, якія спяваюць у оперных тэатрах або сталі выдатнымі інструменталістамі, але яны мастацтву вучыліся ў музычных школах і мой уклад у іхнюю адукацыю толькі пачатковы. Ала Каменская вучылася, м.інш., у школе № 6.

— Вернемся цяпер назад. Вы сказалі, што ўжо ў чатырнаццацігадовым узросце зайгралі на забаве ў Шарнях. Многа прыходзілася яшчэ граць?

— У той час вяселлі адбываліся ў нядзелю і панядзелак — сама менш два дні. А забавы то ў суботы і нядзелі, у святочныя дні. У 1959 годзе я пайшоў вучыцца ў Бельскі белліцэй, тады яшчэ аўтобусы ў нас не ездзілі, я даязджаў у Бельск поездам. Трэба было хадзіць на станцыю ў Рыгораўцы, тры кіламетры цераз багну. У веснавы час, калі снег тапнеў, немагчыма было суха прайсці і трэба было разбувацца, басанож праходзіць цераз багну, абувацца і далей! А восенню ці ранняй вясною яшчэ і цёмна было, бо ж калі поезд ад'язджаў недзе ў сем гадзін, то трэба было сама менш у шэсць гадзін выходзіць з хаты. І гэтак хадзіла ўся моладзь, гэта быў такі цяжкі час. Але не хварэў!

Аднаго году было вяселле ў Рыгораўцах, а мама паехала ў ліцэй на бацькоўскі сход. І сказала дырэктару Кастыцэвічу, што назаўтра сын не прыйдзе на заняткі, бо грае на вяселлі. А дырэктар абурыўся, як гэта заміж хадзіць у школу, вучань на вяселлі грае. Мама перапужалася, адразу зайшла ў Рыгораўцы і загадала мне ехаць у школу — так як загадаў дырэктар. А на вяселлі трэба было граць да чацвёртай-пятай гадзіны раніцы і я з таго вяселля адразу ў школу паехаў. Сябру, што сядзеў са мной за адной партай, бадай Толіка Навіцкага з Тыневіч, я папрасіў, каб ён мяне штурхаў, каб не заснуць. Так я прасядзеў заняткі, а ж на вяселле зноў трэба, бо прыданне. Здрамнуўся ў поездзе і так канчаў тое музыкаванне. Такое было тое маладое жыццё. Але свае грошы ўжо я меў.

У 1963 годзе закончыў я ліцэй і паступіў у настаўніцкую студыю, хаця спачатку хацеў у аўтамабільную школу ў Пілу.

— У армію захацелася?

— Ну, малады быў, іншыя ад нас туды паехалі і тую школу закончылі. Але як мы заехалі ў тую часць, як там нам далі чосу, як пагналі кругом пляца, то я кінуў усё тое і паехаў назад. Зайшоў у настаўніцкую студыю, а там мне кажуць, што маюць вольныя месцы на музычнай падрыхтоўцы. Гэта вельмі добра, сказаў я, бо я акурат музыкую. А на чым вы граеце? На акардэоне і на тэнары ў духавым аркестры. Загадалі зайграць; я зайграў. „Jest pan przyjęty; proszę szybko dostarczyć dokumenty".

— А вяселлі — дзе прыходзілася іграць: далёка?

— У многіх мясцовасцях Бельшчыны і Гайнаўшчыны. Нават у пушчы — у Арэшкаве давялося некалькі разоў іграць.

— То ж там такія размузыкаваныя людзі...

— Але якія там былі вяселлі — там цэлую вёску запрашалі на вяселле! У Орлі аднойчы папрасілі на Новы год іграць, а я сама грыпам захварэў. Другога музыканта няма і рабі што хочаш. Прыехалі па мяне: „Мусіш ехаць!". Але мяне падлечылі. Я яшчэ малады быў, гарэлкі не піў. А нехта сказаў спірту мне даць. Падказалі мне, як спірт піць і я некалькі кілішкаў выпіў — і я граў цэлую ноч! Орля, Крывятычы, Махнатае, Кашалі, Градалі, Кошкі, Дубяжын — ну, ува ўсіх навакольных мясцовасцях таксама. У ліцэі граў на вечарынах; а пра вяселлі прасіў маму ў школе не згадваць. Перастаў іграць па вяселлях і забавах, калі стаў на першую працу ў Трасцянцы. У школах навучаў не толькі на ўроках музыкі, але вёў таксама вакальныя і інструментальныя калектывы. Асабліва ў Гарадку, дзе яшчэ і музычны кружок быў, мае акардэаністы не мелі раўні. Асабліва многа працы патрабавалася ў секцыі шчыпковых інструментаў, дзе кожную гітару ці мандаліну трэба было састроіць перад кожнай рэпетыцыяй.

— Можна сказаць, што ўсю сваю душу Вы ўкладвалі ў музычную адукацыю маладога пакалення.

— Таксама працаваў я з 1987 да гэтага года ў Ваяводскім асяродку анімацыі культуры, з 1983 да 1992 года вёў хор Беларускага таварыства ў Беластоку, з 1967 да 2002 года вёў гарадоцкі хор, чатыры гады працаваў з „Хлопцамі-Рыбалоўцамі". З 1999 да сёлета працаваў з кабарэ „Шпілька" ў ВААКу, дзе ў экстранным парадку заступіў ранейшага акампаніятара, які выехаў за граніцу. З гэтым кабарэ з'ездзіў у Галандыю, у Эйндхавен, дзе на працягу тыдня выступалі ў дамах ціхай старасці. Аказваецца, што на захадзе вельмі любяць рускія песні — „Калінку", „Казачок", „Каробушку"... Са „Шпількай" былі ў Шчучыне, Навагрудку і Лідзе ў Беларусі, у Краславе на „Свяце Даўгавы" ў Латвіі, у Львове.

— А калі Вы пачалі запісваць нашу музычную культуру, з чаго гэта пачалося?

— Гэтую працу я пачаў у канцы 1970-х гадоў, калі ўжо з'явіліся ў нас магнітафоны „Grundig". Я тады працаваў у школе № 6 у Беластоку. Мама адной з вучаніц была загадчыцай крамы з электроннымі прыборамі, што насупраць палаца Браніцкіх, і яна мне памагла яго купіць. І калі я пісаў магістэрскую працу ў Вышэйшай педагагічнай школе ў Кельцах, тэмай яе сталі хрысціянныя песні Усходняй Беласточчыны.

— А Вы мне нічога пра гэтую школу яшчэ не сказалі...

— Я канчаў Вышэйшую педагагічную школу ў Быдгашчы, але там яшчэ не было магістэрыя, толькі было вышэйшае прафвучылішча. А мне хацелася мець поўную адукацыю са званнем магістра, таму я падаўся ў Кельцы, дзе была магчымасць здзейсніць гэта. У Кельцы прыязджаў прафесар Махль з Кракава, якога я запытаўся, ці можна за тэму працы ўзяць песні Усходняй Беласточчыны. Ён спачатку сумняваўся, ці песень з беларускага асяроддзя не трэба будзе перакладаць на польскую мову. Але я сказаў, што прывязу гэтыя песні і тады можна будзе вырашыць, ці той пераклад патрэбны з-за блізкасці моў; ён дасканала ведаў украінскую мову, бо сам нарадзіўся ў Львове. І вырашыў, што нічога перакладаць не трэба, толькі патлумачыць некаторыя фразы. І для тае працы выбраў 107 песень — ад Буга да Сакольшчыны. Вынік быў дасканады, бо я атрымаў выдатную ацэнку.

З таго пачалося. Калі стаў працаваць у ВААКу ў 1987 годзе, з наступнага года стаў даязджаць у Рыбалы. А лідар „Хлопцаў-Рыбалоўцаў" Мікалай Ігнацюк пісаў рэпертуар для калектыву. Ён цікава працаваў: спачатку ствараў мелодыю, калі навейваўся працяг ☞10

Сцяпан Копа з жонкай Аннай (другая справа) на юбілеі „Нараўчанак"

фота Міры ЛУКШЫ

Ля акна, калі плечы твае дымам арабінавым пахлі...

Не ведаю чаму, але ты ў такія моманты вельмі любіла знаходзіцца ля акна.

Вядома, на пятым паверсе нас не маглі заўважыць мінакі ці хто небудзь з тых, хто жыве насупраць. Аднак сама сітуацыя — была даволі рызыкоўнай, дзёрзкай, узбуджальнай. Я бачыў перад сабою тваю дзіўную, тонкую шыйку, дакладна акрэсленыя плечы, адкрытую спінку з рухомымі лапаткамі — і сам таксама правальваўся ў гэтае акно, імкліва падаў уніз, у шапотна-росную траву, у разарваную нашым мятным подыхам прастору...

Так, мы бачылі разам з табою неба. А можа, у гэтыя хвіліны ты бачыла зусім не неба?!. Можа, ты бачыла ў шыбе адлюстраванне самой сябе? І лёгкія аблачыны хацелі прапасці ў тваіх вачах, як і ты — дзесьці там, у іх лёгкасці й бязважкасці. Вецер шалёным вар'ятам прасіўся цалаваць твае вусны; і ты адчувала гэта, і зусім малая адлегласць была паміж лёгка-парыўным подыхам яго і тваімі вуснамі; толькі гэтую неверагодна малую адлегласць адолець было немагчыма. Дрэвы, высокія, стромкія дрэвы сваімі вершалінамі амаль краналіся тваіх шчок — і ўсё ж заставаліся — па-за-там. І цябе яшчэ болей вярэдзіла, яшчэ болей заводзіла гэтае па-затам — хоць, спадзяюся, і мае дотыкі і абдымкі заводзілі цябе не ў меншай ступені.

Але, хіба можа быць тут дарэчным слова „ступень", калі былі дарэчы зусім іншыя словы?.. „Калі мы прападзем, калі мы абрынемся!.." „Калі ты так кранаешся, так праводзіш!.." „Гэту лагчынку, гэту ямінку — бачыш?.. Яна — чакае цябе..." „А я — хачу піць!.. твой салодкі адчай, тваю немагчымую прыгажосць, тваю ўраганную пачуццёвасць!.."

І трымцела, туманілася акно; і ўжо нам было — не стрываць і не стрывацца, не дыхаць, не гаварыць і не выжыць.

На мяккім варсістым паласе, ляжалі мы на падлозе.

У прыадчыненае акно далікатна, сцярожка і нетаропка ў пакой прасочваўся цёплы кастрычнік. І я дыхаў міжволі ў такт твайму плечыку, што падымаўся і апускаўся так безабаронна і так прыгожа, і пахнуў чамусьці восеньскім арабінавым дымам...

19.09.2010

Ігар СІДАРУК

Міра ЛУКША

* * *

мая душа гаворыць з вашай
у белай хмары над Падляшшам

звілі гняздзечкі ў зорным голлі
не адляцяць адсюль ніколі

і сыплюць дожджык слёз урадлівы
на родныя лугі і нівы

чула кранаюць цёплай ласкай
верных людзей з зямлі падляшскай

Літаратурная серада з Петручуком

Ваяводская бібліятэка імя Л. Гурніцкага ў Беластоку запрашае на сустрэчу з Васілём Петручуком у рамках цыкла „Літаратурныя серады". Сустрэча пачнецца 6 кастрычніка 2010 г. у 17.00 г. у Галоўнай пазычальні кніг па вул. Кілінскага 11 у Беластоку. Можна будзе набыць кнігі аўтара, м.інш. „Księga hańby", „Крышынкі" і „Blizny".

9 ☞працяг

Сцяпану КОПУ 65

яму нейкі матыў, ён бег у хату і запісваў той матыў на магнітафон, пасля яго слухаў і складаў да гэтага тэкст! Такім чынам ён склаў бадай чатырнаццаць песень, якія пасля спяваў з „Хлопцамі-Рыбалоўцамі". Ён звярнуўся да мяне, каб тыя песні прыстойна апрацаваць, каб пакінуць па іх памятку. Я сказаў, што чатырнаццаць, гэта крышку замала, каб хаця дваццаць было. Ён дастаўляў мне чарговыя прапановы, а я рабіў для іх нотны запіс, а мелодыю іграў на акардэоне і запісваў на магнітафон, а ён далей працаваў над тэкстам. Так паўстала „Чорная хмара" пра Райск, „Як тут над Бугам", пра абарону „точак". А тэма тая з'явілася ў яго ў аўтобусе, калі ён вяртаўся з Беластока ў Рыбалы. Прысела да яго жанчына і стала ўсхвалявана расказваць пра ход баёў над Бугам, пра параненага афіцэра, які планаваў заснаваць сям'ю, вучыцца, працаваць. А тут успыхнула вайна, баец атрымаў смяротнае раненне... У 1991 годзе дваццаць песень Мікалая Ігнацюка былі запісаны ў спеўнік.

фота Міры ЛУКШЫ

Я пабачыў, што запіс песень не з'яўляецца складанай праблемай і, ездзячы да калектываў, стаў збіраць наша песеннае багацце. Пачаў з Дабрывады. Ад Антаніны Сідарук, якая ездзіла да дачкі ў Беласток, я запісваў песні едучы разам у поездзе! Пры нагодзе кансультацый перад аглядамі беларускай песні, перад фэстамі я сабраў там 94 песні з цэлага каляндарнага года; спеўнік выйшаў у 1994 годзе. У той час я ўжо пачаў такую ж працу з „Тыневічанкамі", песні якіх краналі маю душу; спеўнік са 123 песнямі выйшаў у 1995 годзе. Прыехаў да мяне Дарафей Фіёнік з песнямі сабранымі падчас экспедыцый па вёсках; так паўстаў у 1998 годзе „Падляшскі спеўнік". На чарзе было Арэшкава — у 2003 годзе. А пасля я падумаў, што ўсюды запісваў песенную спадчыну, а вось яшчэ ў сваіх Малінніках гэтым не займаўся; зборнік выйшаў у 2006 годзе. Ад самой 87-гадовай цяпер Надзеі Сахарчук менавіта з Маліннік я запісаў 102 песні — народную оперу, а ўсяго каля трохсот песень з навакольных вёсак, але не ўва ўсіх мясцовасцях захаваліся ўжо носьбіты песеннай спадчыны. У 2008 годзе выйшлі „Хрысцінныя песні".

У спеўніках запісаны ўсе песні, звязаныя з гадавымі святамі, хаця не ўсё я запісваў, напрыклад, не запісваў калядак, бо яны запісаны ў багагласніках. Хаця крыху шкада, бо ёсць песні гэтага перыяду, звязаныя са свецкімі абрадамі, напрыклад, у Арлянскай гміне запісаў такія творы, якіх я раней не ведаў. Вось, прыходзяць каляднікі, спяваюць спачатку калядкі. Калі ў хаце ёсць маладажоны, яшчэ без дзяцей, то тым маладым віншаванні і „Многае лета". Калі старажылы — таксама „Многае лета". Калі ўжо ёсць дзіцятка — для хлопчыка спяваліся адны песні, а для дзяўчынкі — іншыя, чаго нідзе больш я не сустрэў. У Арлянскай гміне сустрэўся з назвай песні-прыбауткі — у цёці Надзі Сахарчук, напрыклад, „Як камар на мусе ажаніўся" — гэта песня пра жывёл і для дзяцей, і адначасна сатыра на дарослых; запісаў я іх каля дзесяці. Зноў песні веснавыя — агулькі і рагулькі, якія ў ваколіцах Вілінава называюць зэліман, а на поўнач ад Беластока — канапелькі. Рагулькамі называлі ў Малінніках, Дабрывадзе, Арэшкаве, а агулькамі больш пад Нараўку. На прадвесні, тыдзень часу па Вялікадні моладзь хадзіла і спявала. З канапелькай хадзілі самі хлопцы, туды дзе былі прыгожыя дзяўчаты і ім там спявалі. А пасля за сабраныя грошы весяліліся. Далей былі веснавыя песні, садонькі, сенакосныя, жніўныя. Былі песні звязаныя з капаннем бульбы, былі веснавыя юр'еўскія песні. У Дабрывадзе спявалі песню „Святы Юрэ-Рыгорэ": дай нам цяпліцу, выпусці травіцу, бо ўжо дабытак не мае чаго есці. Альбо — канчалася Руздво і наступалі два тыдні Масленіцы, якую ў нас звалі Мясніцамі — быў гэта час карнавалу, дзе моладзь весялілася перад наступленнем Вялікага посту.

Былі гэта песні каляндарнага цыкла, але апрача іх былі і песні сямейнага цыкла: вяселле, хрысціны і паховіны. Але паховін я таксама не ўключаў у зборнік, бо гэта найчасцей рускія тэксты запісаныя ў багагласніках.

У Арэшкаве, Тыневічах ці Дабрывадзе я запісаў песні, наспяваныя тамашнімі калектывамі, ад якіх немагчыма запісаць усе вясельныя песні, усе хрысцінныя. А, для прыкладу, у Арлянскай гміне адна песня спяваецца па-рознаму ў розных вёсках, мяняюцца ў залежнасці ад мясцовасці і мелодыя, і тэкст. Напрыклад, хрысціны — прыйшлі людзі, выпілі, расслабіліся, пачыналіся жартоўныя песні. Важнымі асобамі на хрысцінах былі кумы, і калі госці падвыпілі, — калісь на хрысціны прыходзілі толькі людзі сямейныя, нельга было там быць дзецям, бо спяваліся тады надта вольныя песні, пра жыццё без прытойвання. Вельмі цікавую хрысцінную песню запісаў я быў ад Любы Лавіцкай, 1900 года нараджэння [родная сястра Янука Дарашкевіча — рэд.], з Меляшкоў: „Раса жыта расіла/ Жана мужа прасіла/ Ідзем, мужу, дадому/ Ідзем, мужу, дадому" і г.д. А на заканчэнне хрысцін „Бывайце здаровы"...

— Развітаемся і мы. Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Гісторыю Беларусі вывучаюць не толькі вялікія ўніверсітэты ці адмыслова створаныя калектывы гісторыкаў. Яе вывучэнне прываблівае і асобных аматараў даўніны. Прычым яны не толькі вывучаюць яе для сябе, але і стараюцца азнаёміць са сваімі здабыткамі іншых зацікаўленых мінуўшчынай. Дзякуючы гэтаму, у інтэрнэце і ствараюцца сайты, дзе можна знайсці разнастайныя звесткі аб падзеях даўніх часоў.

Адным з прыкладаў такога сайта з'яўляецца „Спадчына Беларусі", які быў створаны невядомым аўтарам і месціцца па адрасе **http://spadczyna.com**. Нягледзячы на тое, што на сайце маецца спецыяльна адведзеная старонка „Аб праекце", даведацца, хто гэта такі руплівец не ёсць магчымым. „Сайт з'яўляецца маім аўтарскім праектам, рэалізацыя якога ажыццяўляецца прыватна без усялякай фінансавай падтрымкі звонку — распавядае там невядомы аматар беларускай гісторыі. — Задача праекта — збіранне і публікацыя ў канспектыўнай форме тэкставага і выяўленчага матэрыялу, звязанага з гісторыяй і мастацтвам Беларусі, пачынаючы ад найдаўнейшых часоў да канца 20-га стагоддзя, з мэтай іх вывучэння і папулярызацыі. Крыніцамі для артыкулаў з'яўляюцца навуковыя і навукова-папулярныя выданні, а таксама матэрыялы ў інтэрнэце, на якія даюцца спасылкі".

Вельмі добрая мэта, але хацелася б, канешне, ведаць, хто менавіта імкнецца яе дасягнуць.

Што ж тычыцца будовы сайта, то яна бачыцца вельмі зручнай, хаця і не зусім традыцыйнай. Першая старонка падзеленая на дзве часткі, але амаль уся важная інфармацыя месціцца на левай, шырэйшай. Прычым тут мы знойдзем не толькі артыкулы па гісторыі, але і тыя, што тычацца мастацтва Беларусі.

Раздзел гісторыі падзелены аўтарам на падрубрыкі. Гэта — „Старажытны перыяд 90 тыс. год да н.э. — VIII ст.", „Перыяд Русі IX — пач. XIII ст.", „Перыяд Рэчы Паспалітай 1569-1795 гг.", „Перыяд Расійскай Імперыі кн. XVIII ст. — 1917 г." і „На шляху да незалежнасці 1917-1991 гг.".

Мастацтва змяшчае старонкі пра архітэктуру (IX-XX стст.), жывапіс (X-XX стст.), графіку (X-XX стст.), пластыку (20 000 год да н.э. — XX ст.) і прыкладное мастацтва (20 000 год да н.э. — XX ст.).

Прыемна бачыць, што аўтар працуе над артыкуламі, якія былі размешчаны раней. Ён дадае нейкую новую інфармацыю па іх тэме альбо нейкія фотаздымкі. Акрамя таго, на сайце ёсць так званы „Даведнік", мэта якога патлумачыць тыя ці іншыя паняцці альбо распавесці пра нейкія даследаванні. Многія артыкулы аздобленыя малюнкамі, а некаторыя — картамі.

Але шмат чаго на сайце яшчэ трэба зрабіць. Так, з трох запланаваных моўных версій — беларускай, рускай і англійскай, — фактычна дзейнічае толькі першая. Аўтар таксама, відаць, меў на мэце дзяленне артыкулаў датычна мясцін. Таму, з правага боку мы можам убачыць рубрыку „Мясьціны", дзе пералічаны рэгіёны Беларусі, а таксама Беласточчына, Браншчына, Віленшчына і Смаленшчына. На жаль, як спасылкі яны не працуюць.

Адным з вартых увагі раздзелаў сайта з'яўляецца „Каляндар", які месціцца крыху ніжэй за „Мясьціны". У ім аўтар адсочвае юбілейныя даты разнастайных гістарычных падзей.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Каманда, якую любяць

Ёсць у Беларусі адна каманда, якую любяць практычна ўсе, незалежна ад іх палітычных перакананняў, жыццёвых поглядаў і нават спартовых прыярытэтаў. Гэта жаночая зборная краіны па баскетболе. Яна з годнасцю выступала на апошніх алімпійскіх гульнях, была бронзавым прызёрам чэмпіянату Еўропы, а зараз упершыню гуляе ў фінальнай стадыі чэмпіянату свету, што праходзіць у чэшскіх гарадах. Выступае і абнадзейвае далей. За апошні перыяд каманда Анатоля Буяльскага зазнала пэўныя змены і страты. Папершае, узяты курс на амаладжэнне, таму дасведчаныя Вольга Падабед і Святлана Вольная ўжо не трапляюць у склад. А найбольшым мінусам стала цяжкая траўма Кацярыны Сныцінай, якая была заўсёды асноўнай „шостай", гэткім джокерам. Зразумела, што яна на гэты раз таксама не выступае. Па гэтай жа прычыне выбыла і Вольга Масілёніне. З абнаўлення ж варта згадаць яшчэ пра новую форму ў выглядзе сукенак, якія істотна дадалі баскетбалісткам жаноцкасці.

Група „А" ў Астраве, куды трапілі нашы дзяўчаты, зусім не выглядала простай. Ужо ў стартавым матчы давялося змагацца з бронзавымі прызёркамі алімпіяды — кітайкамі. У гэтай сустрэчы беларускі ўпэўнена ўзялі рэванш за чвэрцьфінальную паразу Пекіна — 68:57. Лепшымі ў складзе былі Юлія Дурэйка, Алена Леўчанка, Наталля Марчанка, як звыкла выдатна на падборы папрацавала Настасся Верамеенка. Леўчанка ўвогуле фантастычная баскетбалістка. Прыбыўшы літаральна з аэрадрома пасля заакіянскіх фінальных баталій у жаночай НБА, яна адразу адзначылася 20 ачкамі і прадуктыўнасцю ў іншых кампанентах. Беларускі здвоены наканечнік Леўчанка — Верамеенка пры належнай падтрымцы дасведчанай цэнтравой Марыны Крэс падаецца зараз мацнейшым прынамсі на еўрапейскім кантыненце. У другой гульні беларускі належна супрацьдзеілі магутнаму чэмпіёну планеты — Аўстраліі. Сенсацыю стварыць не ўдалося — 59:83, хоць момантамі нашы выглядалі абсалютна на роўных. Шаля вагаў на бок аўстралійек канчаткова схілілася толькі ў заключнай чвэрці.

Апошні матч у квартэце — з Канадай, па сутнасці меў ужо характар гульні наступнай стадыі. Рэч у тым, што абедзве дружыны ўжо забяспечылі выхад далей і змагаліся за каштоўныя ачкі. Цягам гэтай сустрэчы перавага беларусак не выклікала сумненняў, у выніку табло зафіксавала 61:49. Праявіліся моцныя бакі нашай зборнай — надзейная абарона ў выглядзе індывідуальнай апекі і ўдалы пазіцыйны розыгрыш. Слабейшыя нашы дзяўчаты ў нагнятанні тэмпу і хуткім адрыве. Таму змагацца за медалі ім будзе ўсё ж праблематычна. Фаварытамі лічацца ЗША, Расія, Аўстралія, Іспанія.

Канчатковая табліца групы „А" набыла наступны выгляд: Аўстралія — 6 ачкоў, Беларусь — 5, Канада — 4, Кітай — 3. У паралельным квартэце „В" пасьянс расклаўся так: ЗША — 6, Францыя — 5, Грэцыя — 4, Сенегал — 3. Такім чынам на другой стадыі ў шасцёрцы з улікам набраных пунктаў беларускам паслядоўна давялося гуляць супраць французанак, амерыканак і грачанак. Для выхаду ў чвэрцьфінал магло хапіць і адной вікторыі, а дзве перамогі напэўна гарантавалі прадоўжыць змаганне з больш выгоднага месца. На момант напісання гэтых радкоў дыспазіцыя была невядомай, але ўпэўненасць, што нашы дзяўчаты выканаюць заданне-мінімум, не пакідала. І нават, калі не ўдасца трапіць у прызёры, што на гэтым турніры вельмі цяжка, гэтую каманду ўсё роўна будуць любіць.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Гояцца ваенныя раны

Адам БОБРЫК

Вайна кончылася 65 гадоў таму. Забрала яна жыццё больш за 72 мільёнаў ахвяр. Шмат ран да сёння засталіся незагойнымі. Яшчэ нямала асоб шукае месцаў паховін сваіх блізкіх. Беларусы змагаліся на шматлікіх франтах. Краіна страціла два з паловай мільёна жыхароў. Многа беларусаў жыло па-за межамі Рэспублікі і таксама яны сталі ахвярамі. Адной з іх быў Ціхан Шалягін, які жыў ва Украіне. Незалежна ад польскага паходжання, як адзначала сям'я, ён лічыў сябе беларусам. Валодаў беларускай і польскай мовамі.

Ціхан працаваў у калгасе трактарыстам. Ніякія тэхнічныя навінкі не былі яму тайнай. Жыццё яго, аднак, не ашчаджала. Стаў удаўцом у дваццаць пару гадоў. Сам выхоўваў сына Уладзіміра. Ажаніўся зноў у маі 1941 года, месяц да атакі Германіі на Савецкі Саюз. Ягоная абранніца, Вера Фёдараўна, мела 21 год, ён тады — 31. Нядоўга цешыўся новым шчасцем. Вайна не дазваляла быць абыякавым. Ціхан працаваў у сельскай гаспадарцы, быў патрэбны для гаспадаркі краіны. Запрапанавалі яму, каб застаўся ў тыле. Не захацеў.

Ціхан сказаў: „Як я буду глядзець у вочы сваім дзецям, калі буду дзесьці сядзець тады, калі іншыя ваююць!" У 1943 г. пайшоў радавым на фронт. Служыў у танкістах I Беларускага фронту Чырвонай Арміі. Летам 1944 г. удзельнічаў у цяжкіх баях у ваколіцы Седльцаў. У ягоны танк трапіў нямецкі снарад. Шалягіну ўдалося вырвацца з полымя. Ды давялося ампутаваць яму ногі. Памёр ад ран некалькі дзён пасля, у жніўні. Дачкі Людмілы ніколі не пабачыў — у хвіліну ягонай смерці было ёй сем месяцаў. Жонка да канца жыцця не даведалася, дзе знаходзіцца магіла мужа. У Дзень перамогі Вера Фёдараўна штогод хадзіла з дзецьмі пад помнікі салдатам вялікай айчыннай вайны і падносіла кветкі з думкай аб сваім найбліжэйшым, які загінуў у барацьбе з фашыстамі на далёкім Падляшшы.

Магілу Ціхана Шалягіна знайшлі ў Седльцах год таму, дзякуючы Чырвонаму Крыжу, яго ўнукі Вольга і Аляксей. Спачывае ён разам з 25 тысячамі салдат, якія тут загінулі. Унукі салдата тады прыбылі з Украіны на ваенны могільнік Чырвонай Арміі і змясцілі на надмагільнай пліце брацкай магілы дзядулеў здымак. Дачка Ціхана Шалягіна Людміла магла сюды прыехаць толькі цяпер, 66 гадоў пасля смерці бацькі. Вельмі перажывала, баялася эмоцыяў. Цяпер, аднак, шчаслівая. Як сказала, „першы раз размаўляла з бацькам!" На магілу ўсклала кветкі, хлеб, гарэлку, яблык і ласункі. „Гэта быў першы падарунак, які я магла даць бацьку", — прызналася.

Пры магіле Ціхана Шалягіна унучка Вольга Карасова (злева) і дачка Людміла Карасова

Сям'я салдата, які загінуў у змаганні з гітлераўцамі, сустрэлася на Падляшшы з вельмі ветлівым прыёмам. Унучка Вольга Карасова з вялікай сардэчнасцю ўспамінала сядзьчан. Вельмі пазітыўна была здзіўлена добрым станам ваеннага могільніка. Сцвердзіла: „Больш за 60 гадоў горад дбаў аб магілу майго дзеда, паставілі помнік. Шчыра прызнаюся, у нашай краіне такога стасунку да памяці аб памерлых я ніколі не сустрэла. Апрача таго, я так камфортна адчувала сябе ў Седльцах, што проста залюбілася ў гэтым горадзе. Не ўспамінаючы аб тым, як нас прынялі ў Гарадской управе! Дзякую Седльцам і іх уладам!". Такім чынам яшчэ адна рана нанесеная вайною зможа зацягнуцца.

У НІЎСКІМ фотааб'ектыве

Фота Міры ЛУКШЫ

Толькі ў нас, такі міш-маш

Адгаданка

1. дзяржава з Ерэванам, 2. оперная песня, 3. раённы цэнтр на рацэ Бася на 31° усходняй даўгаты, 4. раённы цэнтр побач возера Нарач, 5. з дванаццаці месяцаў, 6. Карл, аўтар „Капіталу", 7. вышэйшае вайсковае званне ў ваенна-марскіх сілах, 8. Лаўрэнцій, аўтар „Катэхізіса" (1627 г.), 9. шэры грызун, 10. адчуванне пакуты, 11. дзяржава з Сафіяй, 12. шырокая і глыбокая пасудзіна для яды, 13. расліна сямейства перцавых, 14. лірычны верш з чатырнаццаці радкоў, 15. непатрэбная драбяза, адкіды, 16. Караткевічаў горад.



Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Станіслава Леца.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 35 нумара

Авёс, брыдж, Горы, грань, ірыгацыя, пан, пожня, Рыміні, хамяк, Чыжы.

Рашэнне: **Няма прыгожых жанчын; ёсць брыдкія і прыгожа грыміраваныя.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Лявону Федаруку** з Рыбал.

03.10 — 09.10

(22.03. — 20.04.) Нішто цябе не стрымае! Без цяжкасцей пераможаш усе абмежаванні. Удасца зрэалізаваць усе свае ідэі. Маладзік Месяца 7.10. прынясе непрацяглае папсаванне настрою. Тое, што пачуеш ад іншых, не вельмі табе спадабаецца.

(21.04. — 21.05.) Колькі ўсяго будзе адбывацца ў першай палове месяца! Амаль з гадзіны ў гадзіну змены, новыя выклікі, а ўсё гэта трэба будзе ўзяць у рукі. Прыемныя хвіліны да 5.10. — 6.10. Не злуйся, асабліва пры драбязе.

(22.05. — 22.06.) Збярэцца крыху цяжкіх спраў для афармлення. Крыху пад горку, знеахвочанне, горыч, нервы, недахоп пачуцця бяспекі. 3-7.10. не абыдзецца без карэктуры планаў; некаторыя рашэнні былі планаваны памылкова. Новыя знаёмствы, новыя магчымасці.

(23.06. — 23.07.) Канец таптання ў месцы. Не стварай сабе выдуманых бар'ер, адважна ідзі ўперад. Смела плануй, энергіі хопіць надоўга. Хоць не ўсё спачатку пакоціцца згодна з тваім планам. 7.10. адкрыецца табе новы раздзел у сямейным жыцці.

(24.07. — 23.08.) Нядаўна пазнаная асоба ўнясе ў тваё жыццё многа творчага ферменту. Тое, што іншым здаецца быць немагчымым, для цябе будзе банальна простым. Вялікая працавітасць, ахвота здабываць новы досвед. Нечаканыя падзеі адкрыюць перад табою зусім новыя гарызонты! Зрабі штосьці з як найбольшым размахам! Добры час на прафесійны развой і добрую забаву.

(24.08. — 23.09.) Зоркі дапінгуюць цябе да дзеяння. Хоць мо не ўсё зашпілена на апошні гузік, і так можаш шмат дасягнуць! Каля 4.10. могуць папсавацца сямейныя рэляцыі (будзь памяркоўным). Шум вакол тваёй асобы можа крыху прыціхнуць. 3-7.10. трымайся здалёк ад фінансавых спраў і не бярыся за важныя вырашэнні ў гэтым плане і не бяры на сябе ніякіх абавязацельстваў.

(24.09. — 23.10.) Пачатак месяца крыху хаатычны, затое чакае цябе рандэву тваіх мараў! Можа аказацца, што хтосьці, каму ты даверыў, спрабуе выкарыстаць твае сакрэты супраць цябе. Калі перасаліў ты з пакупкамі, каля 8.10. трэба будзе зацісну́ць пояс. 7.10. зоркі падкінуць табе шмат сілы і жыццярадаснасці.

(24.10. — 22.11.) Умеласць хуткага і талковага вырашэння праблем. Лёгка ўпарадкуеш бягучыя справы і складзеш планы на будучыню. 8.10. з лёгкасцю адшукаеш сваю ўласную дарогу і развяжаш цяжкія дылемы. 3-7.10, хоць будзе нялёгка, будзь шчырым, нічога не хавай перад блізкімі, калі нават бароняцца перад праўдай.

(23.11. — 22.12.) Спачатку будзеш непакорны і непрадказальны, не ўсё ўкладзецца па-твойму. 7.10. асветліцца твая дарога, захоўваючы цябе ад памылак. Добры час на падарожжы, здабыванне ведаў. 6-8.10. засяродзься, слухай інтуіцыі (можаш высвятліць складаныя справы).

(23.12. — 20.01.) Да 4.10. не ўсе твае рашэнні будуць слушнымі. 6-10.10. — добры час на падарожжы, здабыванне новых ведаў. Многа выдаткаў, прынамсі да 7.10. Чым менш чакаеш, тым больш прыемна штосьці цябе задзівіць.

(21.01. — 19.02.) Касмічныя буры плюс твой выбуховы характар — мяшанка ад якой выбухі якіх свет не бачыў! Будзеш недысцыплінаваны, лянівы ды нецярплівы аж да невыноснасці. Будзе моцна ўзмацняцца твая незалежнасць. Рабі тое на што маеш ахвоту. А лёс рыхтуе табе незвычайны прэзент! Толькі працягнуць руку!

(20.02. — 21.03.) Здаровы розум прыдаецца, ды не слухай яго, бо не дацэніш сваёй геніяльнай ідэі! Да 4.10. будзеш прынамсі адчуваць здаровую рэальнасць, але і справішся з выклікамі. У шалёным тэмпе не згубіш дарогі! Самастойна не прымай ніякіх лекаў.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

ПАДЗІВІЦЦА НА ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

(пачатак у 39 н-ры)

Скіт у Адрынках першы і адзін у пасляваеннай Польшчы. Не ў тым аднак яго прыцягальная сіла. Калі спытацца ў людзей, чаму цягнуць з адлеглых паветаў і гарадоў „на канец свету", адкажуць: да айца Гаўрыіла. Ён для кожнага мае добрае слова, суцешыць у бядзе, падкажа як лекавацца. Словы прызнання выкажуць асцярожна, рахмана. Каб пустой хвальбой не наклікаць бяды. У глыбі душы жыве яшчэ памяць пра крыўду якая сустрэла архімандрыта вясной 2008 года, калі, хворы ды дэградаваны, быў вымушаны кінуць Супрасльскую лаўру і схавацца пасярод балот і кустоў у невядомым тады астраўку Кудак. Сёння, калі ўвесь закалот і боль перакаваліся ў адраджэнне святога месца, усе нягоды і супярэчлівасці бачацца як неабходнасць.

— Я сама *nic nie mam do powiedzenia*, — кажа Ніна з прыпушчанскай вёскі, — але каб не тая крыўда, людзі не прыязджалі б, не дапамагалі б яму.

— Было-прайшло, — папраўле жонку дзядзька Аляксей. — І бачыце, як усё на добрую дарогу павярнула. Дасць Бог, то яшчэ другая Грабарка ў нас будзе.

* * *

Год таму, калі ў Кудаку першы раз святкавалі дзень Антонія і Феадосія Кіева-Пячэрскіх, паломнікі дабіраліся на машынах, палявой дарогай ад Адрынок. Непадалёк скіта арганізавалі дзве стаянкі. Першую для паломнікаў, другую — для самавітых гасцей. Дастойнікі пад'язджалі на ўзгорак дзе скіт. Паколькі гэтай дарогай меў дабірацца сам мітрапаліт Сава, Рада гміны ў Нарве прысвоіла сцежцы імя кіеўскіх імяніннікаў. Сёлета, ад вясны, дарога месцамі выглядала як рэчка, у выезджаных каляінах плавалі карасі і п'яўкі. Людзі заходзілі ў голаў, якім спосабам мітрапаліт дабярэцца ў Кудак. Спачатку пайшла чутка пра верталёт. Хтось заклінаўся, быццам на астраўку збудавалі мініяцюрны аэрадром. Мы праверылі інтрыгуючую чутку. У пустэльні пакуль няма лётнішча. Калі мы спыталіся пра авіятранспарт у чалавека ад арганізацыі руху, той толькі пацінуў плячыма і адказаў: „Не дурыце мазгоў!"

Наш народ узалежніўся ад язды на фальксвагенах і таётах. Яшчэ нядаўна ў пілігрымкі „хадзілі". Зараз усе едуць на аўтакарах, на матацыклах, лётаюць на самалётах. Быццам забыліся, што кожны ахвярны шлях неабходна пазначыць жывымі слядамі, адпакутаваць, перадумаць свае правіны і занядбанні.

Гадзіну да таго, як з'явіўся мітрапаліт Сава, паломнікі стаялі на беразе астраўка і жыва абмяркоўвалі пытанне: *Як жа дабярэцца ён у пустэльню?* Ніхто не хацеў убачыць першаіерарха як звычайнага пешахода. Кладка з Адрынок у Кудак, па якой прыйшлі паломнікі, цягнецца восемсот метраў.

— Яму нельга хадзіць, — меркавалі спачувальна жанчыны. — Ён пасля інсульту. Яшчэ закружыцца яму ў галаве і ўпадзе ў балота...

Дзесьці ў палове дзесятай гадзіны з астраўка, па кладцы, на другі бераг, адправіўся джып архімандрыта (падарунак ад добрых людзей). На час, калі машына перабівалася вузкай кладкай, запынілі назад пешаходаў. „Усё ясна", — шапталі на беразе. Прывязуць самаходзікам. Мітрапаліт не павінен хадзіць нагамі.

Беларуска-падляшскі народ здольны памяняць свае меркаванні ў адну секунду. Мітрапаліт Сава рашыўся прайсці кладку пяшком. Калі, пад чорным парасонам, наблізіўся ён да грамады на астраўку, тыя самыя цёткі, што апраўдвалі яго „прыезд", ужо гларыфікавалі „прыход":

— Маладзец, Сава! — выказвалі ўголас захапленне. — Не пашкадаваў сябе! Маладзец!

* * *

Месцы праваслаўнага культу на Беласточчыне, нягледзячы на адміранне вёсак, адраджаюцца і натхняюць да жыцця. Цягам першай паловы верасня г.г. мітрапаліт Сава асвяціў новую царкву ў Баброўніках, гістарычную капліцу ў Ласінцы з 1724 года, якая прайшла грунтоўны рамонт, домік-скіт архімандрыта Гаўрыіла. Ідучы ў дажджы ў скіт я думала пра дар вяртання духовых каштоўнасцей. У такіх хвілінах чалавек разумее цану легендаў, падмуркаў ды руінаў. Дзякуючы гэтай, здавалася б, кволай аснове, магчыма павязаць пазрываныя ў гады ліхалецця ніці радзімай гісторыі. Паводле жыхароў Адрынок, яшчэ ў першай палове XX стагоддзя ля іх сяла на ўзгорках знаходзіліся каменныя фундаменты Узнясенскага манастыра. І сёння, вакол гэтых узгоркаў, захаваліся зямныя насыпы ўмацаваныя драўлянымі жэрдкамі. Манастырскія будынкі і цэрквы мелі напамінаць абарончыя вежы. Іх заняпад пачаўся ўжо ў час польска-шведскай вайны, калі загінула трэцяя частка насельніцтва Падляшша.

Дзвесце метраў ад легендарных фундаментаў сустрэнем царкоўку св. Іанна Златавуснага. Пра месца кажуць „Крыначка" або „Жураўлік".

— Кудак таксама лічылі святым месцам, — кажа беластачанка Раіса, родам з Адрынок. У час яе дзяцінства ва ўрочышчы ля дубоў адпачывалі касцы. Даліна выглядала інакш як цяпер, усюды, аж па гарызонт, стаялі стагі. Каб справіцца з сенакосамі, мужчыны выходзілі на касьбу пасля Тройцы і сенавалі да Яна, пасля ад Ганны *праталі* атаву. Раіса разам з маці прыносіла абед бацьку:

— Сярод касцоў быў Кастусь Анхімюк, бацька епіскапа Іераміі, — успамінае Раіса. — Вроцлаўскі епіскап родам з Адрынок. Яго бацька апавядаў, што калісь у Кудаку стаяла царква. Старэйшыя людзі распавядалі пра званы, чутныя з-пад зямлі. Іншыя цвердзілі, што званы гучалі ў паветры, якраз тут пад дубамі....

Пасля, у дарослым жыцці, калі ў сям'і здарыўся трагічны выпадак і не было куды падзецца ад гора, Раісе *прыдаўся* сон. Пабачыла як на яве: у Кудак ідуць трох нагіх манахаў-іерархаў.

Сон-прывід, хоць засароміў жанчыну, наклікаў гаючы супакой. Дзесьці ў цемры Раіса ўчула царкоўныя званы.

Цяпер разумее сэнс:

— Бог падказаў, што ў гэтым месцы адродзіцца царква і людзі будуць ісці па *благадаць!*

(працяг будзе)

ISSN 0546-1960